СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 4.57, 21.16, 16.19;
Віцебск — 4.40, 21.12, 16.32;
Магілёў — 4.48, 21.05, 16.19;
Гомель — 4.49, 20.56, 16.07;
Гродна — 5.12, 21.31, 16.19;
Брэст — 5.21, 21.23, 16.02.

МЕСЯЦ:
Поўня 16 мая.

ІМЯНІНЫ:
Міколы;
Галены, Юліі.

ЗВЯЗДА

22 МАЯ 1992 г.
пятніца, № 101 (21879)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 50 кап.

РОЗГАЛАС

ЗНОЎ РТУЦЬ...

ГРОДНА. (Б. Пракопчык). Вечарам у міліцыю пазваніў мужчына і паведаміў, што халя дома № 44 па вуліцы Курчатава раскіданы шарыкі ртуці. Каля месца здарэння былі аператыўна выстаўлены ахоўныя пасты, сюды ж прыехалі работнікі штаба грамадзянскай абароны вобласці, якія разам са спецыялістамі выратавальнай службы аб'яднання «Азот» сабралі 800 грамаў небяспечнага рэчыва. Падрабязнасці — у наступным нумары.

УЗГАДАЕМ ВЯЛІКУЮ АСВЕТНІЦУ

23 мая Беларуская грэка-каталіцкая (уніяцкая) царква ўшаноўвае святую Прадславу-Ефрасінню Полацкую, асветніцу Беларусі. Свята адзначае як грэка-каталіцкая, так і праваслаўная царква, розніца толькі ў каляндарных днях.

Аднак Беларускай грэка-каталіцкай царквой гэтаму святу надаецца больш увагі, як і святам усіх беларускіх святых. Асаблівага абраду святкавання няма, але ў гэты дзень у час святочнай літургіі гучаць малітвы «За беларускі народ» і звернутыя да Святой Ефрасінні — заступніцы Беларусі. У храмах абавязкова прысутнічае абраз з выявай Ефрасінні Полацкай, а асноўная частка святкаванняў, безумоўна, адбываецца ў самім Полацку, дзе асветніца пачала сваю дзейнасць.

Што напісана пяром—вельмі лёгка

«высякаецца», як паказвае жыццё

З учарашняга дня на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі перастае дзейнічаць пагадненне, падпісанае зімой гэтага года кіраўнікамі краін СНД, у тым ліку і Б. Ельцыным, аб вяртанні гістарычных і культурных каштоўнасцей дзяржавам іх паходжання. Такое рашэнне прыняў Савет Рэспублікі ВС Расіі. Ніякіх тлумачэнняў пры гэтым дадзена не было.

А мы так спадзяваліся...

НА 99 ПРАЦЭНТАЎ

можа пацвердзіцца сенсацыйная неафіцыйная інфармацыя, якую нам паведамілі з колаў, блізкіх да кіраўніцтва Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь. Сутнасць яе ў наступным— **з панядзелка, 25 мая,** Беларусь пачынае ўводзіць уласныя грошы. Спачатку мяркуецца 50 працэнтаў зарплаты выдаваць новымі грашамі, потым, выкарыстоўваючы словы М. Гарбачова, «працэс пойдзе». А адзін працэнт ад праўдзівасці гэтай інфармацыі ўсё ж пакінем на ўсялякія нечаканыя выпадкі. У нас жа нічога нельга дакладна прагназіраваць.

ВЫБРАНЫ ЧЛЕНКОРАМ

Старшыня Савета Міністраў Беларусі Вячаслаў Кебіч выбраны членам-карэспандэнтам Міжнароднай інжынернай акадэміі па спецыяльнасці «Эканоміка». Паведамленне аб гэтым, а таксама віншаванні прэм'ер-міністру змешчаны ў тэлеграме, якая паступіла ў Савет Міністраў рэспублікі ад імя кіраўніцтва Міжнароднай інжынернай акадэміі з Масквы.

Метро страціла кожнага пятага пасажыра

МІНСК. Пасля павышэння цэн на паслугі метрапалітэна з пяці да дваццаці, потым сарака капеек, а цяпер фармальна да рубля адны катэгарычна заяўлялі, што людзі прывыкнуць да новых цэн і будуць ездзіць як звычайна, другія скептычна заяўлялі, што колькасць пасажыраў метро значна паменшыцца. Апошнія даныя мінгарстата паказалі, што рацыю маюць скептыкі. Так, мінскім метрапалітэнам з пачатку года перавезена 29,2 мільёна пасажыраў. Лічбы ўражваюць, але аб'ём перавозак у параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года скараціўся на 22 працэнты. Такім чынам, метро страціла амаль кожнага пятага патэнцыяльнага пасажыра!

Супрацоўніцтва атрымае падтрымку

Першы намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларусі Міхаіл Мясніковіч прыняў у Доме ўрада групу італьянскіх бізнесменаў на чале з прэзідэнтам фінансава-гандлёвай холдынг-кампаніі «Фор трэйд фінэнсінг» панам Джакома Кора. Сфера дзейнасці кампаніі і яе фірм — фінансаванне, гандаль, прамысловае і сельскагаспадарчае інвесціраванне, інвесціраванне пад нерухомасць і пад новыя тэхналогіі.

У час прайшоўшых перагавораў пан Дж. Кора расказаў аб сваіх уражаннях ад знаходжання ў нашай рэспубліцы, аб сустрэчах з прадстаўнікамі яе дзелавых колаў, аб планах дзейнасці кампаніі ў Беларусі. У прыватнасці, ужо ёсць папярэдняя дамоўленасць з нашым Знешэканомбанкам аб стварэнні сумеснага прадпрыемства.

Служба інфармацыі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

СУСТРЭЧА, ЯКОЙ ЗАДАВОЛЕНЫ ЎСЕ

Прэзідэнт Фінляндыі Мауна Койвіста стаў першым з лідэраў краін свету, якія пачалі «асвойваць» суверэнную і незалежную Рэспубліку Беларусь. І гэта, думаецца, не выпадкова. Па-першае, нашы народы здаўна цягнуцца адзін да аднаго, незалежна ад палітычнай абстаноўкі, нейкіх там сітуацый і павеваў імкнуліся раней, імкнуцца і зараз шукаць агульныя пункты гледжання як на становішча ў свеце, так і ў сваіх краінах. А, па-другое, многія вытворчыя калектывы ўсталявалі і працягваюць усталёўваць дзелавыя партнёрскія сувязі і кантакты паміж сабой... Трывалыя ўзаемаадносіны ёсць і ў сферах культуры, навукі, спорту. Пасля афіцыйнага візіту Прэзідэнта Фінляндыі ў Мінск іх, гэтых сувязей і кантактаў, стане, несумненна, яшчэ больш.

Сустракаючыся з нашым кіраўніцтвам, Мауна Койвіста не прамінуў зазначыць: цяпер у Хельсінкі якраз ідзе сустрэча краін—удзельнікаў Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, якая будзе завершана на найвышэйшым палітычным узроўні. Выказаўшы надзею, што ў ёй прыме ўдзел і Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч, наш госць дадаў, што Фінляндыя гатова развіваць сувязі з Беларуссю ў самых розных сектарах жыцця грамадства, паміж гарадамі, арганізацыямі, саюзамі і, што, як мне падалося, асабліва важна — паміж звычайнымі людзьмі... М. Койвіста так і сказаў: «Звычайнымі...», гэта значыць, і паміж намі з фінамі, чытач.

Богу б у вушы, гэтыя словы! Так, цяпер мэтамі і беларускага, і фінскага бакоў павінны стаць добрыя цывілізаваныя сувязі і кантакты паміж двума еўрапейскімі нацыямі. І служыць яны павінны Чалавеку.

Параўнальна невялікая Фінляндыя займае на еўрапейскім кантыненце сваё, цывілізаванае і адметнае становішча. У гарантаванні і ўмацаванні бяспекі ў Еўропе яна, без перабольшання, не адзін год задае, як кажуць, тон. Да голасу спачатку Урха Кеканена, а цяпер — Мауна Койвісты прыслухоўваліся і прыслухоўваюцца самыя высокапастаўленыя, аўтарытэтныя, і нават — агрэсіўныя дзеячы і палітыкі — як Захаду, так і Усходу. І вельмі прыемна было пачуць з вуснаў высокага госця беларускай сталіцы: «Мы гатовы да дыялога і падтрымліваем удзел Беларусі ў рабоце форумаў, на якіх разглядаюцца і будуць разглядацца надалей самыя розныя пытанні і праблемы жыцця і супрацоўніцтва на нашым кантыненце».

Пасля перагавораў дэлегацый Рэспублікі Беларусь і Фінляндскай Рэспублікі на чале са Станіславам Шушкевічам і Мауна Койвістам высокі госць меў сустрэчу са Старшынёй Савета Міністраў Беларусі Вячаславам Кебічам. Цёпла і шчыра гутарылі яны, Вячаслаў Францавіч высока ацаніў асабістую ролю Койвісты як прадаўжальніка палітыкі, закладзенай папярэднімі фінскімі кіраўнікамі Паасіківі і Кеканенам. «Вопыт Фінляндыі мае для Беларусі асаблівую каштоўнасць, — сказаў В. Кебіч. — Абвясціўшы сябе нейтральнай і бяз'ядзернай, наша рэспубліка возьме для сябе шмат што з гэтага вопыту...»

М. Койвіста і на гэты раз выказаўся за шырокае і шматбаковае супрацоўніцтва паміж дзвюма суверэннымі краінамі.

Пасля перагавораў адбылося падпісанне міжурадавага пагаднення аб гандлі і эканамічным супрацоўніцтве. З беларускага боку яго падпісаў старшыня Камітэта па знешніх эканамічных сувязях Уладзімір Радкевіч, з фінскага — міністр замежных спраў Паава Вяюрунен.

А затым адбылася прэс-канферэнцыя для журналістаў. І хоць прадстаўнікоў друку, тэлебачання і радыё было на ёй няшмат, размова адбылася цікавая і карысная. Прэзідэнт Фінляндыі спадабаўся нам сваёй адкрытасцю і шчырасцю. Ён верыць у нашу лепшую будучыню, спадзяецца, што будуць знойдзены шляхі, якія адкрыюць душы і сэрцы беларусаў і фінаў адзін для аднаго. Дзень для кіраўніка суседняй краіны быў напружаным і адказным, але, як сказаў сам Прэзідэнт, ён задаволены ўсім. І прыёмам у Мінску, і падпісаным пагадненнем, і сустрэчай з намі, журналістамі... У сваю чаргу, усё спадабалася і нам.

Анатоль МЯСНІКОЎ.

На здымках:
У. Радкевіч і П. Вяюрунен падпісваюць міжурадавае пагадненне;
у час прэс-канферэнцыі.
Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

РАДЫЁФАКТ

У пачатку чэрвеня ў Рыо-дэ-Жанейра пройдзе канферэнцыя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па навакольнаму асяроддзю. У яе рабоце будзе ўдзельнічаць беларуская дэлегацыя на чале са Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. Шушкевічам.

У Мінску падпісаны пагадненні паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб міжнародных аўтамабільных і чыгуначных зносінах цераз дзяржаўную беларускую граніцу. Калі для Польшчы падпісанне гэтых дакументаў з'ява звычайная, то для Беларусі гэта гістарычны акт. Справа ў тым, што яшчэ зусім нядаўна гэтую прэрагатыву мелі выключна саюзныя органы, а пасля развалу СССР іх функцыі ўзялі на сябе і выконвалі расійскія міністэрствы.

У «Радыёфакт» прыйшоў ліст з Пінска за подпісам сямі народных дэпутатаў гарадскога Савета. Гэта адкрытае пісьмо кіраўнікам гарвыканкома. Сярод іншых, у пісьме ўтрымліваецца і такое пытанне: «Чаму, калі мясакамбінат завалены мясам, трэба выстойваць даўжэзныя чэргі, каб набыць кавалак гэтага прадукту, ці каўбасу?» Адказваючы на гэтае пытанне, першы намеснік старшыні Пінскага гарвыканкома П. Цішук засведчыў, што, сапраўды, у халадзільніках мясцовага камбіната маецца каля 500 тон ялавічыны і 150 тон птушкі». Сітуацыю П. Цішук тлумачыць так: «І выканком не дапрацоўвае, і з намі, мусіць, не лічыцца ўрад і нават сітуацыю на месцах дасканала ён не ведае...»

У Мінску выйшаў з друку «Даведнік нарматыўна-заканадаўчых актаў удзельніка знешнеэканамічнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь». Ён уключае адрасы і тэлефоны рэспубліканскіх органаў кіравання знешнегандлёвых ведамстваў, устаноў і фірм замежных прадстаўніцтваў на тэрыторыі Беларусі. У даведнік таксама ўключаны рэкамендацыі па гандлёва-пасрэдніцкіх аперацыях, маркецінгавай і рэкламнай дзейнасці, валютнаму і мытнаму рэгуляванню, падаткаабкладанню і страхаванню.

Як паведамляе рэспубліканскі цэнтр па прафілактыцы СНІДу, у нашай рэспубліцы зарэгістраваны яшчэ дзве асобы з ВІЧ-інфекцыяй. Сярод тых, хто ўжывае наркотыкі ўнутрывенна, гэта першы выпадак выяўлення заражэнняў СНІДам на тэрыторыі былога Саюза. Адзін з іх — карэнны жыхар Беларусі, другі — выхадзец з Каўказа. Абодва ў мінулым мелі мноства палавых сувязей, у тым ліку з прадстаўнікамі груп рызыкі.

З тэрыторыі базы трэста «Белспецмантаж» знікла 7 тон 345 кілаграмаў латуннага пракату ў злітках на 14 тысяч 983 рублі і 80 капеек.

Ян, напэўна, заўважыў чытач, кіраўнікі трэста падлічылі нават капейкі. Хацелася б верыць, што яны ў стане падлічыць, у якую суму абыходзіцца дзяржаве пошук украдзенага...

Без шырокага апавяшчэння ўсе аддзяленні Беларускага нацыянальнага банка ў Пінску распакавалі цюкі зношаных грашовых білетаў, якія прызначаліся для адпраўкі на утылізацыю ў Маскву. Толькі ў гэтым палескім горадзе ў абарот выпушчана падраных чырвонцаў і 25-рублёвак на агульную суму 800 тысяч рублёў.

Сцёртыя, як кажуць, да дзірак, гэтыя грашовыя знакі, вядома, выклікалі шмат нараканняў ля касавых апаратаў і акенцаў ашчадных банкаў. Але скаргі скаргамі, а ўсе ўстановы Пінска зараз безагаворачна прымаюць рваныя і клееныя грошы.

Чарга перайменаванняў дайшла, нарэшце, і да Дзяржаўнай бібліятэкі імя Леніна ў Мінску. Цяпер яна будзе насіць назву «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».

«ІДЗІ Ж, НАРОДЗЕ ЎВАСКРЭСЛЫ!»

«Душа сама ведае, дзе святло, дзе праўда, дзе Бог, — ціха расказвае мне бабулька, якую гарачы людскі натоўп усё шчыльней прыціскае да мяне. — Паслухай сябе: ці не праўда, з сэрца ідзе радасць? Гэта твая душа цягнецца да святла Нязгаснай лампады, да святога агню. Ён растопіць усё нядобрае, ачысціць, а ты толькі захавай гэтае святло, не патушы злом».

«Нязгасная лампада», што ўзгаралася перад Вялікаднем ад агню ля Труны Гасподняй у Іерусаліме, прыйшла да нас на Свята славянскага пісьменства і славянскіх культур. Яе неслі тым шляхам, якім ішлі да нас святыя роўнаапостальскія Кірыла і Мяфодзій, несучы людзям святло ведаў і духоўнасці. Сённяшні шлях міратворчай місіі пралёг і праз краіну, дзе не ўсё зараз спакойна, дзе людзі не могуць пазбавіцца варажнечы, забыўшыся на духоўныя запаведзі славянскіх першаасветнікаў: усе свае спрэчкі вырашаць праз слова, памятаць яго магутную сілу. Мы забыліся на гэтую мудрасць, за што расплачваемся братняй крывёю, дачасна змярцвелымі ад нянавісці сэрцамі.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ВІТАМІННЫ АЛФАВІТ

B_1 B_2 B_3

Працягваем публікацыю «вітаміннага алфавіта». Наступны вітамін, у якім мае вялікую патрэбу арганізм чалавека,— з групы «В».

ВІТАМІН B_1 (тыямін)

Ён аказвае ўплыў на стан нервовай сістэмы. Сутачная норма 2—3 мг. Пры яго нястачы парушаецца дзейнасць нервовай сістэмы, узнікаюць неўрозы, неўрастэнія, пагаршаецца абмен бялкоў і вуглявод, засваенне цукру арганізмам, работа сэрца. З'яўляецца мышачная слабасць, ацёкі ног, млоснасць і задышка нават пры невялікіх недамаганнях. Павялічваецца ядавітае дзеянне этылавага спірту і нікаціну. Нястача вітаміну B_1— адна з прычын узнікнення і абвастрэння радыкуліту.

Крыніцы вітаміну B_1 — хлеб (асабліва шэры з непрасеянай мукі), каша ячневая, аўсяная, пшанічная, грэцкая, фасоля, соя, гарох, каляровая капуста, дрожджы, хлебны квас, печань, ныркі, мяса.

ВІТАМІН B_2 (рыбафлавін)

Сутачная патрэба 2—3 мг. Павышае засваяльнасць страў, паляпшае абмен рэчываў, нармалізуе зрок. Калі яго не хапае, узнікае запаленне вуснаў, слізістай абалонкі рота, скуры твару, паяўляюцца галаўныя болі, назіраецца адсутнасць апетыту, зніжаецца працаздольнасць. Развіваецца малакроўе, дрэнна загойваюцца раны.

Крыніцы вітаміну B_2 — хлеб, агародніна (асабліва капуста), салата, морква, злакі, рыбы, зялёны гарошак, сліўы, персікі, а таксама малако, тварог, мяса, яйкі, дрожджы.

ВІТАМІН B_3 (пантатэнавая кіслата)

Сутачная патрэба 5—10 мг. Гэты вітамін неабходны для нармальнага абмену рэчываў, у першую чаргу бялкоў, стымулюе крывятварэнне, развіццё натуральнага імунітэту супраць некаторых захворванняў. Ён часткова сінтэзуецца мікраарганізмамі, якія знаходзяцца ў кішэчніку чалавека. Пры нястачы гэтага вітаміну парушаецца засваенне бялкоў, вуглявод і тлушчаў у працэсе харчавання. Узнікаюць болі ў сэрцы, вяласць, апатыя, а таксама захворванні страўніка і кішак, запаленне скуры, наступае заўчаснае пасівенне валасоў.

Паколькі гэты вітамін упрымліваецца ў многіх прадуктах харчавання, арганізм даволі рэдка адчувае яго нястачу. Крыніца вітаміну B_3 — хлеб, бульба, морква, дрожджы, печань, мяса, малако, яйкі і інш.

Адзначым таксама, што зараз у аптэках вітамінных прэпаратаў амаль што няма, ды і выкарыстоўваць іх трэба толькі па прадпісанню ўрача. Таму свежыя агародніна, садавіна, розная зеляніна, на якія такі шчодры (будзем спадзявацца!) наступаючы летні сезон,— тая крыніца, якую неабходна ў найбольшай ступені выкарыстаць для ўмацавання ўласнага здароўя.

ЛЯСНАЯ АПТЭКА

Бяроза—белая сяброўка

Беластволую прыгажуню бярозу спрадвеку цанілі не толькі за яе прыгажосць, але і за тую карысць, што яна прыносіць людзям. Усё ў бярозы — ад непрыкметнай пупышкі да бярозты, а таксама і грыб чага, што вырастае на кары бярозы,— гаючае.

Бярозавыя пупышкі збіраюць ранняй вясной, калі яны толькі пачынаюць набухаць (у сакавіку-красавіку). Пажадана зразаць галінкі са старых дрэў, звязваць іх у пучкі, сушыць пад навесцю ці на гарышчы.

Чагу можна збіраць круглы год. Яе ссякаюць сякерай, здрабняюць да 3—5 см і сушаць пры тэмпературы не вышэй 60 градусаў.

Пры хваробах нырак і мачавога пузыра, ацёках, вадзянцы ўжываюць настойку (1:5), адвар ці настой з пупышак. Настой гатуюць з разліку адна чайная лыжка пупышак на паўшклянкі кіпню. Прымаць па дзве-тры сталовыя лыжкі тры-чатыры разы ў дзень. Адвар гатуюць з разліку 30 грамаў пупышак на адну шклянку і прымаюць гэтак жа, як і настой.

Пры запаленні суставаў (рэўматычнага і падагрычнага характару), пры ранах, што доўга не загойваюцца і гнаяцца, язвах, пролежнях рэкамендуюць выкарыстоўваць як вонкавае для ўціранняў, кампрэсаў і прымочак настойку бярозавых пупышак на 70-працэнтным спірце (1:5).

Пры кашлі дзве сталовыя лыжкі бярозавых пупышак змяшаць з 70 грамамі несалёнага масла. Паставіць на агонь, давесці да кіпення, але не кіпяціць. Трымаць на павольным агні ці ў духоўцы ад сарака хвілін да адной гадзіны. Зняць з агню, калі будзе яшчэ цёплае, працадзіць, адціснуць. Пупышкі адкінуць, а ў атрыманую масу дадаць 200 грамаў мёду і добра размяшаць. Гэтую сумесь прымаць па адной сталовай лыжцы чатыры разы ў дзень.

Пры запаленні печані, пры язвеннай хваробе страўніка і дванаццаціперснай кішкі бяруць 50 грамаў пупышак бярозы, настойваюць іх на працягу дзесяці дзён на 500 грамах гарэлкі і прымаюць па адной чайнай лыжцы з вадой тры разы ў дзень за 15—20 хвілін да яды.

Як мачагонны сродак і проціцынготны прэпарат выкарыстоўваюць адвар са свежага бярозавага лісця, якое заварваюць кіпнем (1:10), настойваюць шэсць гадзін і прымаюць па паўшклянкі два-тры разы ў дзень.

Пры ляўэнні гастрытаў, язвеннай хваробе страўніка, пры розных пухлінах у вобласці страўніка і кішэчніка выкарыстоўваюць настой чагі. Грыб мыюць і замочваюць у гатаванай вадзе на чатыры-пяць гадзін, потым здрабняюць (можна цераз мясарубку) і настойваюць у гэтай жа вадзе, падагрэтай да 50 градусаў, двое сутак (можна ў тэрмасе). Асадак адціскаюць, фільтруюць праз некалькі слаёў марлі, дабаўляюць ваду да патрэбнага аб'ёму (1:5). Настой можна захоўваць у халадзільніку тры-чатыры дні. Пры пухлінах рэкамендуюць не менш чым тры шклянкі ў суткі дробнымі порцыямі за 30 хвілін да яды. Пры гэтым неабходна малочна-раслінная дыета.

ВАША ЗДАРОЎЕ

Асцярожна з часнакам

У літаратуры пра часнок усюды напісана, што без яго не абысціся, быццам бы лечыць ён амаль усе хваробы. А ў народзе да часнака адносіны заўсёды былі асцярожныя.

Прыблізна з 50-х гадоў ходзіць па руках так званы «Рэцэпт кітайскага гомеапатычнага сродку». У ім сказана, што часнок, настояны на спірце і прымаемы па схеме (ад адной кроплі да 20 і зноў да адной), лечыць гіпертанію, інфаркт, стэнакардыю, склероз сасудаў галаўнога мозгу, паляпшае зрок і г. д.

Шматгадовыя назіранні сведчаць: сапраўды, некаторыя хворыя атрымлівалі часовую палёгку — сціхалі галаўныя болі, паніжаўся крывяны ціск. Але стойкага выніку не было. А вось гастрыт, захворванні падстраўнікавай залозы пасля ўжывання такой настойкі абвастраліся.

Хворыя псарыязам расказваюць, якімі парадамі яны імкнуліся карыстацца: змазвалі сокам часнаку ці часночнай кашкай паражоныя ўчасткі скуры і пілі часночныя настойкі. Спачатку быццам бы такое лячэнне і дапамагае, але хутка хвароба абвастраецца. Ды інакш і быць не можа. Бо псарыяз — захворванне ўнутраных органаў, а не скуры. У прыватнасці, яно звязана з парушэннямі функцый печані, падстраўнікавай залозы. На гэтыя органы, калі яны не ў норме, часнок уздзейнічае адмоўна. Ад яго ўжывання могуць таксама абвастрацца халецыстыт, хранічныя запаленчыя гінекалагічныя захворванні.

Не трэба давяраць міфам аб лекавых уласцівасцях раслін. Такім міфам з'яўляецца, у прыватнасці, лячэнне часнаком парадантозу. На самай справе ад гэтага хворыя дзясны яшчэ больш запаляюцца і баляць. Пасля часночных інгаляцый пры прастудных захворваннях многія скардзяцца на болі ў вобласці сэрца. Тут ёсць прамая сувязь.

Раяць ужываць часнок як прафілактычны проціпухлінны сродак. Ёсць людзі, якія наскрозь прапахлі часнакам ад такой «прафілактыкі». Але практыкай не даказана, што часнок валодае падобнымі ўласцівасцямі. А вось што вядома дакладна: пры анкалагічных захворваннях лёгкіх ад ўдыхання часнаку стан хворага рэзка пагаршаецца.

ЗОНА АСАБЛІВАЙ УВАГІ

ВОСЬМАЯ КАМАНДЗІРОЎКА

Званю неяк генеральнаму дырэктару гомельскага абласнога вытворчага аб'яднання «Фармацыя» Пятру Францавічу Нікіпорчыку, а сакратарка адказвае:

— Шэф у камандзіроўцы ў Германіі.

— З якой мэтай? — цікаўлюся.

— Эдмунд Ленгфельдэр лінію для вырабу стэрыльных інфузійных растораў нам дорыць. Магутнасць яе — 200 літраў у дзень. Дэфіцыт у гэтым растворы, які ідзе ў капельніцы, хутка значна зменшыцца.

Яшчэ раней давялося размаўляць з галоўным урачом абласной санэпідэмстанцыі Валерыем Іосіфавічам Ключановічам. І той пахваліўся, што атрымаў некалькі навейшых прэпаратаў і абсталяванне, якія намнога аблегчылі работу калектыву, дазволілі хутчэй і дакладней рабіць неабходныя аналізы. Прывёз іх з сабой усё той жа Эдмунд Ленгфельдэр.

І вось я сустрэўся з ім. Быў выхадны дзень, але 49-гадовы прафесар Мюнхенскага універсітэта не адпачываў. Ён прымаў экзамен у медыкаў абласной бальніцы і эндакрыналагічнага дыспансера на веданне нямецкай і англійскай моў. З тым каб яны змаглі паехаць на стажыроўку ў Германію, павучыцца, як ён сказаў, рабоце на еўрапейскім узроўні, асвоіць сучаснае абсталяванне, якое затым будзе перададзена бальніцам і паліклінікам Гомельшчыны. Некалькі чалавек паказалі даволі трывалыя веды і хутка адправяцца ў Мюнхен, астатнім жа было рэкамендавана падвучыцца. Да жніўня-верасня, калі прафесар зноў прыедзе ў Беларусь. Ужо ў дзевяты раз.

— Якая мэта камандзіровак? — перапытвае прафесар.— Вядома ж, Чарнобыль. Мы, еўрапейцы, як вядома, сядзім у адной лодцы. Тут без згоды не абысціся, без скаардынаванай работы — таксама...

Па ўсім відаць, чалавек ён вельмі сціплы, высокай навуковай культуры, вялікі знаўца сваёй справы. Закончыў дзве вышэйшыя навучальныя ўстановы — медык, фізік і электронік. Два гады працаваў у Лондане ў галіне радыяцыйнай медыцыны. Вось і ўсё, што ён звычайна расказвае пра сябе. Затое пра справы інстытута радыяцыйных даследаванняў імя Ота Хуга, які вядомы не толькі ў Германіі, але і далёка за яе межамі, гаворыць больш ахвотна.

Установа аб'яднала універсітэцкіх прафесараў краіны і не з'яўляецца дзяржаўнай структурай. Гэта незалежная арганізацыя: па тых ці іншых пытаннях яна мае свае асабістыя меркаванні, якія могуць не супадаць з думкай урада, афіцыяльнай інстанцыі. Так, супрацоўнікі інстытута лічаць, што вывады, зробленыя экспертамі МАГАТЭ адносна сітуацыі ў раёнах, пацярпеўшых ад чарнобыльскай катастрофы, мякка кажучы, няправільныя. Бо з іх даследаванняў «выпалі» ліквідатары, частка насельніцтва, што яшчэ ў 1986 годзе была эвакуіравана з забруджаных радыяцыяй вёсак. Аб небяспецы радыенуклідаў гаворыць і тое, што ў дзяцей назіраецца рост анкалагічных захворванняў шчытападобнай залозы.

Дык вось, інстытут імя Ота Хуга як недзяржаўная арганізацыя атрымлівае грашовыя сродкі ад прыватных асоб і грамадскасці Германіі з тым, каб розыгбажова дапамагаць чарнобыльцам Беларусі, Украіны і Расіі. Ён распрацаваў доўгатэрміновую праграму, якую зараз і ажыццяўляе. На яе затрачана ўжо шэсць з палавінай мільёнаў марак, у тым ліку на Беларусь — чатыры мільёны. Два мільёны прыпала на Гомельшчыну, якая найбольш пацярпела ад чарнобыльскай катастрофы.

Спецыфіка інстытута ў тым, што ён больш супрацоўнічае з грамадскімі арганізацыямі, такімі, напрыклад, як фонды «Жыццё пасля Чарнобыля» ў Мінску і «Дапамога дзецям Чарнобыля» ў Гомелі. Праекты інстытута пачалі паспяхова ўкараняцца больш як паўгода назад, а разлічана работа на некалькі гадоў. У кожны свой прыезд Эдмунд Ленгфельдэр працуе ў краінах СНД не дзень-два, а столькі, колькі патрабуе справа,—два, тры, а то і больш тыдняў. Ён не толькі дапамагае ўстанаўліваць медыцынскую апаратуру, якую прывозіць з сабой, але і правярае яе работу, робіць прыём пацыентаў, праводзіць субяседванні з нашымі медыкамі і г. д. Пры гэтым інстытут ставіць абавязковую ўмову—каб устаноўленыя прыборы працавалі менавіта ў той бальніцы ці паліклініцы, куды іх першапачаткова завезлі. Нямецкія шэфы могуць без усялякага папярэджання прыехаць да нас і праверыць выкананне гэтай умовы.

У восьмую сваю камандзіроўку ў Гомель Эдмунд Ленгфельдэр прывёз чатыры гемааналізатары крыві, якія былі перададзены Хойніцкай райбальніцы і тром бальніцам і дыспансерам абласнога цэнтра. Калі ўлічыць, што гэтыя апараты даюць магчымасць за кароткі час выдаць аналіз крыві адразу па дваццаці параметрах і што дагэтуль у вобласці быў усяго адзін такі гемааналізатар, важнасць гэтай дабрачыннай акцыі стане зусім зразумелай.

Акрамя таго, прафесар наведаў намесніка старшыні аблвыканкома Аляксандра Ярчака і вёў з ім перагаворы аб тым, каб органы мясцовай улады паклапаціліся аб выдзяленні інстытуту памяшкання для яго філіяла ў Гомелі. Гэта будзе своеасаблівая штаб-кватэра для каардынацыі дзеянняў беларускіх медыкаў, якія працуюць па праграме інстытута. Ужо зацверджана і яго прадстаўніца — Наталля Баброўская, якая працуе ў фондзе «Дапамога дзецям Чарнобыля» і бездакорна валодае нямецкай мовай.

Філіял ствараецца для таго, каб больш эфектыўна працаваць над змяншэннем вынікаў чарнобыльскай трагедыі. Напрыклад, канкрэтны ўчастак работы — стварыць у Гомелі цэнтр для лячэння шчытападобнай залозы. Ён стане дзейнічаць на базе абласнога эндакрыналагічнага дыспансера, куды будуць пастаўлены неабходнае медыцынскае абсталяванне, прэпараты і інш. На яго патрабуецца (у тым ліку і на абслугоўванне на працягу пяці гадоў) тры з палавінай мільёны марак. Адна з першачарговых задач — навучыць гомельскіх урачоў прагрэсіўнай методыцы лячэння хвароб, выкліканых радыяцыйным уздзеяннем. Дарэчы, цэнтр мяркуецца адкрыць у пачатку наступнага года. Тут змогуць лячыцца да дзесяці тысяч дзяцей.

У Эдмунда Ленгфельдэра, як бачым, устанавіліся цесныя кантакты з многімі ўрачамі вобласці. Ад імя сваіх калег ён запэўнівае, што і надалей інстытут імя Ота Хуга, грамадскія арганізацыі Германіі і яе ўрад будуць дапамагаць чарнобыльцам пераадольваць вынікі ядзернай катастрофы.

Хочацца нізка пакланіцца гэтаму чалавеку, калектыву інстытута за іх высакароднасць і бескарыслівасць у вялікай справе. Вельмі і вельмі важнай для нас...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

На здымку: прафесар Эдмунд **ЛЕНГФЕЛЬДЭР.**

Фота Алены ЛЯОНЕНКА.

СЯМЕЙНАЯ ЭКАНОМІКА

Вось такія кулічы...

Пра гэту жанчыну «Звязда» пісала ўжо гадоў дзесяць назад. Тады яе, перадавую цялятніцу саўгаса «Новы шлях» Добрушскага раёна, пакрыўдзіла мясцовае начальства, і газеце давялося ўмешвацца.

Нядаўна наш карэспандэнт, будучы ў Добрушы, зайшоў пацікавіцца, як жыве былы жывёлавод, а цяпер пенсіянерка М. А. ШЫШЛАКОВА.

Марыя Апанасаўна рыхтавалася да Вялікадня: замешвала цеста для кулічоў, «майстравала» галубцы і нетаропка расказвала.

— Як жывецца, пытаецеся? Асабліва хваліцца няма чым, але ж і гараваць няма калі. Заўтра збяруцца дзеці, унукі: вось і стараюся, каб свята з імі сустрэць як найлепш.

Мучыца яшчэ са старых запасаў, цяперашняй, талоннай, хапіла б, мусіць, толькі на адзін куліч. Яйкі, дзякуй Богу, ёсць, куры нясуцца спраўна. Мяса і капуста таксама са склепа. І з гарэлкай пашанцавала — днямі саўгас недзе раздабыў для рабочых па літры спірту. Так што будзе чым разгавецца. Цукру ў сакавіку зэканоміла (красавіцкія талоны засталіся неатаварамі).

ДАРЭЧЫ

З 1990 года Марыя Апанасаўна на пенсіі, атрымлівае 445 рублёў. Працягвае працаваць прыбіральшчыцай на кормазаводзе свайго саўгаса — гэта яшчэ 250 рублёў. Яе муж Леанід Дзям'янавіч — сантэхнік саўгаснай нацельнай з акладам 1.400 рублёў. Да гэтаго наля сарака гадоў працаваў механізатарам, пастухом, на пенсію збіраецца праз тры гады. У саўгасе «Новы шлях» (цяпер ён называецца саўгас-камбінат) працуе сын Анатоль. Жывёлаводам стаў зяць, таксама ў гэтай гаспадарцы.

— Дзецям два гады назад, працягвае гаспадыня, — саўгас выдзеліў добраўпарадкаваны кватэры. Канешне, не без нашай з бацькам дапамогі паспелі абставіцца па тых яшчэ цэнах. Цяпер наўрад ці пацягнулі б — адна сценка столькі зараз каштуе, што і вымавіць цяжка. Сыну «Масквіч» купілі ўскладчыну, таксама да падарожання, а матацыкл бацька памяняў на міні-трактар. Так што і «конь» свой. Ну і апрануць ёсць чаго са старых запасаў.

У гэтым годзе ў магазіны, асабліва прамтаварныя, заходзім рэдка, а грошы ўсё роўна «ляцяць» так хутка, што не паспяваю пералічыць як след.

А тут яшчэ гэты пракляты Чарнобыль. Абодва ўнукі нарадзіліся ў год, калі здарылася бяда. Старэйшы — Паўлік, дзякуй Богу, расце спраўна. А вось Андрэйка часта хварэе, стаіць на ўліку. Вось і зараз дачка павезла яго ў Крым, у санаторый для «чарнобыльскіх» дзяцей па путёўцы нашай бальніцы. Вядома ж, не без грошай паехала.

ДАРЭЧЫ

Толькі на трэці год пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС Добрушскі раён быў прызнаны «пацярпеўшым», а да гэтага лічыўся ў «чыстых». Усе дарослыя члены сям'і Шышлаковых атрымліваюць па 40 рублёў ад чарнобыльскіх. У сакавіку гэтага года ўпершыню і Андрэйку «перапала» ад гуманітарнай дапамогі — па пасылцы з германскай мукой, цукрам, тушонкай.

— Канешне, — умешваецца ў нашу размову Леанід Дзям'янавіч, — ёсць у пасёлку сем'і, якім жывецца горш, чым нам. Але ж мы доўга і многа працавалі. Узяць Марыю — яна ж з ранку да цёмнага няньчалася то з парасятамі саўгаснымі, то з каровамі, цялушкамі. Па надоях, прыватах першыя месцы ў раёне займала ў «застойныя» гады. Ад маскоўскай ВДНГ падарункі атрымлівала, ды і мясцовыя ўлады ўзнагародамі не абыходзілі. І зарабляла добра, амаль заўсёды — больш за мяне. Цяпер жыццё прымусіла больш сваёй гаспадаркай займацца. Трымаем карову, чатырох парасят, курэй, бульбу, буракі вырошчваем. Дзякуй Богу, цяпер ёсць дзе садзіць: каля хаты 20 сотак зямлі, ды на саўгасным полі (можа калі і нашым будзе) — 25 сотак.

І ўсё ж, у будучыню заглядваць страшна. Не веру, што будзе наша жыццё лепшым.

ДАРЭЧЫ

З дэфіцытам Леанід Дзям'янавіч пачаў змагацца яшчэ тры гады назад. Вырошчвае на градцы за хлевам тытунь. Сам зрабіў прыстасаванне для яго рэзкі — цяпер на талоны на «гэта зелле» і не глядзіць. Да тонкасці адпрацаваў тэхналогію выробу віна са сваіх яблыкаў. Сёлета запланаваў пасеяць цукровыя буракі. Навошта — пакуль што, нама, сакрэт.

— А нічога, — аптымістычна перабівае гаспадара Марыя Апанасаўна, — скончацца, нарэшце, мітынгі, стане менш начальнікаў, ды пабольшае ў людзей работы — выжывем. А не будзе мукі ў магазінах, да будучага Вялікадня сваёй наробім.

Віктар КРАЎЧАНКА.

НАТАТКІ ПАЛІТОЛАГА

БЕЛАРУСЬ У ГЕАПАЛІТЫЦЫ

IV. Ці паспрыяе Захад нашай заможнасці?

З усіх міжнародных праблем Беларусі найбольш важнай выдаецца праблема знешнеэканамічных сувязей, уваходу нацыянальнай эканомікі ў сусветны рынак, яе месца ў міжнародным падзеле працы і вытворчасці.

Цяжкасці пачынаюцца ўжо з акрэслення мэтаў, якія ставіць перад сабой Беларусь у міжнароднай эканамічнай прасторы. Калі б іх паспрабавалі сфармуляваць, скажам, урад, прадпрымальніцкія колы і радавыя едакі хлеба, дык разнастайнасць і нават супярэчнасць патрэб і поглядаў былі б відавочнымі. Агульнадзяржаўнай, ці нацыянальнай, канцэпцыі знешнеэканамічнай палітыкі выпрацаваць яшчэ не ўдалося. Таму бясспрэчнымі можна лічыць толькі самыя агульныя ісціны:

а) на Усходзе інтарэс Беларусі заключаецца ў тым, каб як мага даўжэй атрымліваць па льготных цэнах паліва і сыравіну; б) на Захадзе нам патрэбны доўгатэрміновыя крэдыты, інвестыцыі і сучасныя тэхналогіі. Калі прадоўжыць аналіз і абагульненне нашых патрэб, дык у рэшце рэшт прыйдзем да высновы: з крызісу і беднасці Беларусь здолее выбрацца толькі пры шырокім супрацоўніцтве з развітымі, багатымі краінамі. А каб высветліць, пры якіх умовах такое супрацоўніцтва магчыма і будзе карысным для Беларусі, варта было б адказаць на пытанне: чым можа зацікавіць гаспадарчы свет сама Беларусь, чым яна можа прывабіць замежных прадпрымальнікаў?

Яшчэ школьныя падручнікі інфармавалі нас, што сусветны капітал, асвойваючы новы геаграфічны рэгіён, спадзяецца знайсці там альбо танную сыравіну, альбо танную рабочую сілу, альбо рынак збыту для сваіх тавараў. Школьныя веды для нас застаюцца аксіёмай, і таму дададзім да іх толькі тое, што ў апошнія дзесяцігоддзі значна ўзрасла каштоўнасць выгаднага геапалітычнага становішча той ці іншай тэрыторыі, магчымасці выкарыстання яе для далейшага палітычнага альбо эканамічнага ўкаранення ў абраным рэгіёне.

Коратка разгледзім шанцы Беларусі прывабіць замежны капітал. Перш за ўсё трэба нагадаць сумнае вызначэнне Беларусі як краіны, беднай на карысныя выкапні і сыравіну ўвогуле. Можна, аднак, зазначыць, што ўласнай сыравіны ў Беларусі не менш, чым у такіх багатых краінах, як Данія і Галандыя, і яе намаганні дасягнуць дабрабыту не выглядаюць з гэтай нагоды дарэмнымі.

Для прыкладу нагадаем, што сусветны рынак сёння без усялякіх абмежаванняў паглынае вырабы з ільну і драўніны, знаходзіць свайго спажыўца і іншая прадукцыя сельскай і лясной гаспадаркі, асабліва пасля глыбокай перапрацоўкі. Альбо другі прыклад: грэчкія і аўстрыйскія прадпрымальнікі даўно нагледзелі беларускае «Эльдарада» — скупляюць за невялікія грошы торф, насычаюць яго рознымі мінеральнымі і арганічнымі дабаўкамі і прадаюць ужо за добрыя грошы ў арабскія краіны. Нарэшце, вядома, што на шматлікіх біржах Беларусі і СНД цэны амаль на ўсе тавары ўздымаюцца да вар'яцкіх памераў, але замежны рынак на некаторыя з іх, якія вырабляюцца якраз у Беларусі, прапануе яшчэ больш высокую плату (цэмент — 30—45 долараў за тону, мачавіна — 135 долараў і г. д.). Прыклады можна доўжыць, але варта падкрэсліць, што распрацоўку сыравіннага патэнцыялу краіны, усё ж такі абмежаванага, трэба пакінуць у руках айчынных, а не замежных фірм.

Не дачакалася пакуль што заходняга капіталу рабочая сіла Беларусі, хоць ёй, здаецца, ёсць чым прывабіць бізнесменаў: сярэдняя аплата амаль у дзесяць разоў (у пераліку на долары) ніжэйшая, чым у суседняй Польшчы, а па ўзроўню агульнай адукацыі, прафесіянальнай кваліфікацыі і руплівасці ў працы — не апошняя ў Еўроле. Аб сумеснай з заходнімі фірмамі вытворчасці на тэрыторыі Беларусі пакуль што больш гаворкі, чым спраў: большасць зарэгістраваных прадпрыемстваў уключыліся ў гандаль, пасрэдніцтва, аказанне паслуг, ды і працуе там нязначная колькасць жыхароў Беларусі.

Больш таго, нязграбка прадбачыць нарастанне хвалі працоўнай эміграцыі з Беларусі на Захад. Як бы мы ставіліся да гэтай незвычайнай для нас з'явы ўрад і грамадскасць, з часам не застанецца іншага выйсця, як пагадзіцца з ёй. А яшчэ лепей было б загадзя ўзаконіць і ўнармаваць міграцыю рабочых рук, забяспечыць юрыдычную абарону грамадзян Беларусі ў суседніх краінах. Варта падкрэсліць, што экспарт рабочай сілы ў свеце лічыцца справай звычайнай, а некаторыя краіны, ян, напрыклад, Турцыя менавіта такім чынам змаглі назапасіць сродкі, неабходныя для таго, каб вывесці на сучасны ўзровень нацыянальную эканоміку.

Значна большую зацікаўленасць замежныя прадпрымальнікі праяўляюць да беларускага рынку. З 10 мільёнамі спажыўцоў у міжнародным гандлі лічацца даволі сур'ёзна. Ужо некалькі гадоў мінскія гатэлі поўнятца коміваяжорамі з суседніх і дальніх краін, заклапочаных адным: каму б што-небудзь прадаць.

Але толькі нямногім з іх спадарожнічае поспех, бо пакупная здольнасць беларускага насельніцтва ледзьве перадольвае бар'еры шасцідоларавых джынсаў і дваццаціцэнтавых цыгарэт. І толькі новапаўсталая айчынная буржуазія дэманструе сваё працвітанне, выдаўшы паўтары тысячы долараў за «форд» ці «мерседэс», у якіх пасля дзесяці гадоў эксплуатацыі на еўрапейскіх дарогах была напярэдадзе даволі нецікавая альтэрнатыва — пайсці пад прэс.

Патрэбна толькі адна ўмова: каб Беларусь па-сапраўднаму была ўцягнута ў еўрапейскі рынак, а заходнія гандлёвыя фірмы пачалі сур'ёзную канкурэнцыю за шлях да нашага спажыўца. Заработная плата ў пераліччэнні на долары павінна дасягнуць памераў, якія дазвалялі б кожнай сям'і купляць штомесяц «спажывецкую карзіну» тавараў па сусветных цэнах. Папярэдняя разлікі паказваюць, што наш сучасны ўзровень жыцця можна было б утрымаць пры сярэдніх заробках недзе ў 100—120 долараў (тут бяруцца пад увагу традыцыйна абмежаваныя запатрабаванні да якасці спажывецкіх тавараў і бытавых паслуг, нізкі кошт арганізацыі адпачынку і вольнага часу, а таксама захаванне дзяржаўнай «дабрачыннасці» ў некаторых сацыяльных сферах — жыллё, ахова здароўя, выхаванне дзяцей і г. д.). Калі ўлічыць, што заробкі пераважнай часткі працоўнага люду не дасягаюць сёння і дваццаці долараў, то можна вызначыць, як далёка нам да інтэграцыі ў еўрапейскі рынак.

Як бачым, камерцыйная цнота Беларусі, хрэстаматыйныя каштоўнасці неасвоенага капіталам рэгіёна пакуль што слаба заахвочваюць заходнія фірмы да ўкладання інвестыцый у нашу эканоміку. А замежныя капіталы нам патрэбныя ўжо зараз, без іх практычна немагчыма правесці даўно наспеўшую рэканструкцыю айчыннай гаспадаркі.

У склаўшыхся геапалітычных і эканамічных рэаліях выйсце для Беларусі бачыцца у выкарыстанні яе геаграфічнага становішча. Гэта меркаванне дадаткова абгрунтоўваецца намерамі тых заходніх фірм, якія пачалі ўжо ўкараняцца ў Беларусі, а іх прадстаўнікі не скрываюць, што рыхтуюцца да прасоўвання далей на Усход, на неабдымны расійскі рынак. Сам лёс падараваў Беларусі магчымасці пасрэдніка паміж Захадам і Усходам. Гэта, можа, было б хоць малой кампенсацыяй за ўсе тыя беды, знішчэнні, трагедыі, якія давялося перацярпець у мінулым народу, які яшчэ ў сівой старажытнасці аблюбаваў сабе абшары на скрыжаванні еўразіяцкіх шляхоў.

Адразу зазначым, што Беларусь не мае і не будзе мець манаполіі ў гэтай ролі. Эфектыўна, з улікам усіх законаў эканомікі, выкарыстоўвае функцыі пасрэдніка Польшча. Бяднейшыя слаі насельніцтва тут выратоўваюцца ад капіталізму, які зваліўся як снег на галаву, спажываючы танныя (у 3—4 разы дзешавейшыя, чым на Захадзе) тавары з Усходу. Дробныя і сярэднія прадпрымальнікі зарабляюць тым, што прывозяць для прыватных гандляроў з СНД таннае адзенне і нейлія дробязі з Турцыі, Гянконга, Таіланда. Буйнейшыя польскія фірмы спрабуюць наладзіць аптовы гандаль заходнімі таварамі з краінамі СНД. Да гэтай ролі гандлёва - пасрэдніцкая дзейнасць змякчае вынікі крызісу і заняпаду нацыянальнай прамысловасці. Польская эканоміка атрымала час для галіновай і тэхналагічнай рэканструкцыі. Другая справа — як гэты час будзе выкарыстаны.

Сваё месца ў пасрэдніцтве паміж Захадам і Усходам утрымліваюць альбо намагаюцца заняць Фінляндыя, балтыйскія краіны, Чэха-Славакія, Венгрыя, Румынія. Размова не ідзе пра тое, каб Беларусь цалкам паўтарала нечы вопыт (хаця, здаецца, не зашкодзіла б, калі б частка сталых прадаўцоў з варшаўскага стадыёна перамясцілася на мінскі стадыён «Дынамо»). Дробны гандаль у тых памерах, у якіх ён існуе зараз, дажыве толькі да выраўноўвання цэн на Усходзе і Захадзе і да арганізацыі цывілізаванага аптовага гандлю.

Беларусь павінна, на наш погляд, паставіць сабе за мэту прывабіць заможных інвестараў з-за граніцы, каб яны адчынялі тут сумесныя і прыватныя гандлёвыя, пасрэдніцкія, транспартныя, турысцкія фірмы, перапрацоўчыя прадпрыемствы, гатэлі, банкі і страхавыя кампаніі. Падаткі, арэнда памяшканняў, кошт розных паслуг, заробкі беларускіх супрацоўнікаў — усё гэта павялічыла б нацыянальны даход рэспублікі, дапамагло б адкавіць яе прамысловы і сельскагаспадарчы патэнцыял. Прывабіць замежны капітал могуць адпаведныя ўмовы: палітычная стабільнасць, спрыяльнае заканадаўства, надзейныя гарантыі супраць нацыяналізацыі ці рэвалюцыйных рэквізіцый. Беларускай дзяржаве варта было б не шкадаваць сродкаў на стварэнне дасканалай інфраструктуры для прадпрымальніцкай дзейнасці: дарог, аэрадромаў, сувязі, пагранічных пераходаў і г. д.

А сёння, дарэчы, адзін пераезд праз Брэсцкі КПП паралізуе ўсякую актыўнасць пераважнай большасці замежных прадпрымальнікаў, застаецца пужалам для іх знаёмых і блізкіх, Бруд, антысанітарыя, чэргі, сварні, хабарніцтва — з усім гэтым даводзіцца сутыкнуцца літаральна на першых метрах беларускай зямлі. Нават найлепей выхаваным замежным гасцям не ўдаецца скрыць пагарду і абурэнне, калі яны ўспамінаюць пра беларускія пагранічныя службы. Урад, каб захацеў, мог бы ў тры дні навесці там парадак, пазбавіць рэспубліку ад такой нясławы...

Ператварыць Беларусь у цэнтр эканамічнага жыцця Усходняй Еўропы, канешне, не проста. Справа не толькі ў прыняцці спрыяльнага для прадпрымальніцтва дзяржаўнага заканадаўства, кансерватызме кіруючых колаў, высокім кошце інфраструктуры. Патрэбны, між іншым, сур'ёзныя намаганні, каб ачысціць рэспубліку ад айчынных і замежных мафіёзна-бандыцкіх груповак. Справа яшчэ і ў тым, каб наблізіць да еўрапейскіх стандартаў культуру быту, міжчалавечых адносін, узровень абслугоўвання кліентаў ва ўсіх канторах і прадпрыемствах.

Важнейшыя інтарэсы застаюцца, аднак, у сферы палітыкі. Шанцы Беларусі як цікавага партнёра для заходніх гаспадарчых колаў павялічваюцца толькі пры стабільных, прыязных яе дачыненнях з прамысловымі і сыравіннымі волатамі — Расіяй, Украінай, Казахстанам. Узаемныя прывілеі ў гандлі і эканамічным супрацоўніцтве, адшліфаваная сістэма фінансавых разлікаў, незаганная праца транспарту і сувязі з усходнімі суседзямі — гэта толькі першыя радкі са спіса патрабаванняў да краіны, якая хацела б стаць «камерцыйным офісам» і перапрацоўча-перавалачнай базай для цэлага рэгіёна.

І тут зноў вернемся да думкі, выказанай у першых частках артыкула: нацыянальным інтарэсам Беларусі адпавядалі б разумныя палітычныя і гаспадарчыя ініцыятывы, усебаковая актыўнасць беларускай дыпламатыі ва Усходняй Еўропе.

З такім багажом Беларусь лепш ацэняць і на Захадзе. Гэтая ідэя, на наш погляд, павінна легчы падмуркам у знешнепалітычную і знешнеэканамічную канцэпцыю рэспублікі, за распрацоўку якой ужо час узяцца па-сапраўднаму.

Леанід ЛОЙКА,
член выканкома
Партыі народнай згоды.

РЫБАЦКІЯ ЗГАДКІ

«Хірургічны» інструмент для драпежніка

Зараз вясна, і многія рыбакі «палююць» на драпежніка. Шчупак, судак, акунь, іншыя драпежныя рыбы часта разам з жыўцом заглытваюць кручок, які без спецыяльнага прыстасавання дастаць вельмі цяжка, амаль немагчыма. Злоўленую рыбіну даводзіцца здымаць са снасці разам з павадком, а на яго месца прывязваць запасны.

Для выцягвання кручка ў такім выпадку існуе спецыяльны камплект прылад (экстрактар, пінцэт, зеўнік). У продажы яны бываюць рэдка, ды і каштуюць нямала. Можна зрабіць універсальнае прыстасаванне, якое заменіць усе вышэйназваныя прадметы.

Звычайны зеўнік можа адначасова служыць і пінцэтам, і экстрактарам. Для гэтага да яго ножак прыпайваюцца наканечнікі ў выглядзе пінцэта, на адным з якіх трэба зрабіць невялікае паглыбленне.

«Дарожка»

Гэта снасць вольна рухаецца за лодкай, прывабліваючы з дапамогай блешні драпежных рыб. Вопытныя рыбакі майструюць яе самі.

Для гэтага трэба мець пад рукамі лёску 0,4—0,6 мм (70—100 метраў), кусок дошкі памерам 2×15×17 см і блешню, якая аснашчана «трайнікам» і «карабінчыкам». Прымацаваная да лодкі шнурам «дарожка» спускаецца на ваду. Калі рыба клюе, яна раскручваецца сама.

Ловяць на гэту прыладу шчупака, акуня, судака — у залежнасці ад афарбоўкі і формы блешні.

★ Перад пачаткам рыбалкі добра памый рукі з мылам. Асабліва гэта датычыцца курыльшчыкаў—такіх пахаў рыба не любіць.

★ Пры сонечным святле светлая лёска на чорным дне свае бляскам адпужвае рыбу, белы кручок—таксама. Такую лёску лепш афарбаваць, а кручок замяніць на цёмны.

★ Перш чым закінуць вуду, трэба добра замаскіравацца на беразе. Рыба бачыць вашу постаць і вуду і адыходзіць ад гэтага месца.

Вочы і вітаміны

Прыгожыя, выразныя, жывыя, — хаму не хочацца, каб яго вочы выглядалі менавіта так? Аказваецца, гэта залежыць, апрача іншых фактараў, і ад ежы, у прыватнасці, ад утрымання ў ёй вельмі каштоўных вітамінаў А, B_2 і С.

Прыпухласць павекаў раніцай пасля сну можа сведчыць аб нястачы ў рацыёне харчавання вітаміну А. Рэкамендуецца есці больш пятрушкі, шпінату, морквы — яны не толькі забяспечаць арганізм вітамінам А, але і палепшаць зрок. Каб пазбавіцца ад сінявы пад вачамі, вельмі карысна спажываць зялёныя салаты. Яны ўтрымліваюць разнастайныя вітаміны.

Наяўнасць вітаміну B_2 надае погляду жывасць, вачам — бляск.

Крыніцамі вітаміну B_2 служаць сухія піўныя дрожджы і зародкі пшаніцы. Што датычыцца вітаміну С, то ім багатыя амаль уся агародніна і садавіна, асабліва цытрусавыя — апельсіны, лімоны, грэйпфруты. Дзякуючы яму захоўваецца рухавасць мышцаў вачэй.

ЯК ЗДЫМАЦЬ НАПРУЖАНАСЦЬ ВАЧЭЙ

Вочы, як люстэрка, адлюстроўваюць усе хваляванні пражытага дня, выдаюць зрокавую і нервовую напружанасць. Паспрабуйце зняць стомленасць. Заплюшчыўшы вочы, сярэднімі пальцамі рук злёгку прамасіруйце іх кругавымі рухамі, пачынаючы ад асновы носа, пад лініяй броваў да вонкавага краю вачэй і зноў вяртаючыся да носа. На 1—2 хвіліны прыкладзіце далоні да заплюшчаных вачэй.

ПРАКТЫКАВАННІ, ЗДОЛЬНЫЯ МНОГАЕ ЗМЯНІЦЬ...

Вядома, што мышцы вачэй знаходзяцца ў пастаянным руху. Спецыяльная гімнастыка спрыяльна ўздзейнічае на іх рухальныя рэакцыі.

Вось некаторыя практыкаванні для вачэй:

● Павольна падымаць і апускаць павекі. Паўтарыць 12 разоў.

● Двума пальцамі злёгку націснуць на вонкавы край вока і энергічна 10 разоў адкрыць і закрыць яго. Тое самае з другім вокам.

● Галава нерухомая, паглядзець уверх, уніз, налева, направа, тое самае ў адваротным напрамку.

● Краем вока павесці ўлева, уверх, уніз, управа. Выконваць пачаргова то левым, то правым вокам.

● Падняць як мага вышэй павекі, апусціць.

● Шырока раскрыць вочы, напружваючы мышцы і скуру твару. Расслабіць.

● Павольна паварочваць галаву справа налева і злева направа, сочачы поглядам за рухамі.

● Выцягнуць наперад руку з алоўкам. Павольна падносіць яго да носа, сочачы за ім вачамі, затым адводзіць у зыходнае становішча.

КАМПРЭСЫ

Калі вочы моцна стомлены і пад імі ўтварыліся сінія кругі, не палянуйцеся зрабіць заспакойваючыя кампрэсы.

Змачыўшы кавалачкі ваты ахалоджаным адварам рамонку або васількоў, прыкладзіце іх да заплюшчаных вачэй. Пры з'яўленні «мяшкоў» рэкамендуецца кампрэс з цёртай бульбы, якую трэба загарнуць у марлю і прыкласці на 15 хвілін. Калі раніцай моцна апухаюць павекі, неабходна раствараць у цеплаватай (лепш за ўсё мінеральнай) вадзе сталовую лыжку буйной марской солі, змачыць растворам ватныя тампоны і пакласці на вочы на 20 хвілін. Змыць чыстай вадой.

Стол для работы з кнігай



У папярэдніх выпусках «Хатняй энцыклапедыі» мы знаёмілі чытачоў з апісаннямі самаробных прадметаў мэблі і хатняга абсталявання з дрэва. Але сапраўднаму майстру дастатковая нейкая ідэя, згульнята малюнка, віць, сутнасць справы і зжыццявіць гэтую ідэю ў залежнасці ад наяўнага матэрыялу і ўмоў сваёй навітары.

Цяпер мы прапануем некалькі такіх ідэй — сталы для работы з кнігай.

1. Стол можа быць элементам кніжнай шафы. Яго стальніца падымаецца ўверх, тумба засоўваецца ў шафу і робіцца наборам паліц. Справа на стале — кутняя пераносная паліца.

2. Стол можа высоўвацца са стэлажу, эканомячы тым самым жылую плошчу. У такім выпадку кнігі на стэлажы заўсёды знаходзяцца пад рукой.

3. Гэта рассоўны столік, ніжнюю частку якога можна лічыць рэзервнай і выкарыстоўваць у якасці паліцы. Пры неабходнасці яна высоўваецца ў бок і становіцца дадатковай стальніцай.



(Працяг у наступным выпуску «Хатняй энцыклапедыі»).

ВОЗГАЛАС

СЛЕД ЧАРАПАХІ НА КАНТРОЛЬНА-СЛЕДАВОЙ ПАЛАСЕ

БРЭСТ. (Ю. Фёдарава). 500 чарапахамі адразу папоўнілася фауна Прыбужжа.

Прычым гэтыя чарапахі прайшлі мытны дагляд. А справа ў тым, што група турыстаў з Сярэдняй Азіі везла з сабой у Польшчу 500 чарапах. Відаць, разлічвалі прадаць гэтых рэдкіх рэліктавых рэптылій на рынках суседняй краіны.

Аднак кантрабанда была выяўлена. Прыйшлося выпусціць чарапах паблізу пагранпаласы.

Можа, самыя смелыя з іх змогуць пераплыць прыгранічны Заходні Буг і апынуцца на польскім беразе. Тут ужо пагранічная варта будзе бездапаможнай.

АБРАЗАННЕ—СПРАВА ЎСЕНАРОДНАЯ?

ГРОДНА. Абласны аддзел аховы здароўя пайшоў насустрач шматлікім зваротам прадстаўнікоў рэлігійнага аб'яднання мусульман Гродна і дазволіў рабіць абразанне крайняй плоці на базе 8-га кірургічнага аддзялення дзіцячай клінічнай бальніцы. Аперацыя для дарослых каштуе 540 рублёў, для дзяцей — 500. Раней вернікі-мусульмане выконвалі гэту рэлігійную традыцыю ў хатніх умовах і амаль што бясплатна. Цяпер, канешне, дорага, але лепш рабіць абразанне ў бальніцы. Больш надзейна.

ТРАЛЕЙБУСНЫ УЛЬТЫМАТУМ

ГРОДНА (Б. Пракопчык). 20 мая прыкладна з 15 да 17 гадзін з вуліц абласнога цэнтра зніклі амаль усе тралейбусы. Сур'ёзныя непрыемнасці ўзніклі ў тысяч гродзенцаў і гасцей горада. Ну, а вадзіцелі тралейбусаў, кінуўшы работу, у гэты час абмяркоўвалі свае надзённыя праблемы. Справа ў тым, што ў аднаднай касе, дзе яны атрымліваюць зарплату, хапіла грошай толькі чалавек на 50. І адразу, як гэта сёння модна, у ход пайшлі ультыматумы. Маўляў, не будзе заўтра зарплаты — увесь горад прымусім хадзіць пешшу.

Кіраўнікі адпаведных гарадскіх службаў, выслухаўшы вадзіцеляў, паабяцалі апаратыўна вырашыць праблему. Але дапамагчы ўсім працоўным калектывам, якія трапілі ў такое ж становішча, проста немагчыма, паколькі ў Гродна грошай не друкуюць.

Міліцыя ўваходзіць у рынак. Пакуль нясмела

Гэтая думка неаднаразова гучала на імправізаваным брыфінгу ў Міністэрстве ўнутраных спраў рэспублікі. Начальнік упраўлення па пытаннях правоў грамадзян, грамадскай бяспекі і абароннай работы Генадзь Данілаў падкрэсліў, што галоўная праблема міліцыі — кадры, якія б валодалі «рыначнай» сітуацыяй. Сёлета юрыдычныя ўстановы рэспублікі далі міліцыі мізэр сваіх выпускнікоў. Фактычна прэстыж міліцэйскіх пагонаў упаў. Той жа юрыст можа зарабіць значна большыя грошы ў малых прадпрыемствах і кааператывах.

Таму ў міністэрстве вызначаны прыярытэтны напрамак: стварэнне якасна новай міліцэйскай акадэміі, якая б рыхтавала высокакваліфікаваныя міліцэйскія кадры. Гэта датычыць і мытнай службы, і падатковай міліцыі.

Цяпер жа беларуская мытня далёкая ад той, якую павінна мець незалежная Беларусь. На брыфінгу называўся выпадак, калі мытныя службы прапусцілі некалькі мяхоў з валютай. Мяхі былі нават з пломбамі. Што датычыцца падаткаў, то працэс іх утойвання пераўзышоў нават самыя смелыя меркаванні. Дзяржаўны бюджэт недаатрымлівае вялікія грошы. І часта менавіта таму, што ў міліцыі не хапае адпаведных спецыялістаў.

Карацей кажучы, рынак пакуль апярэджвае вартавых правапарадку. Але апошнія таксама не хочуць мірыцца з пазіцыяй назіральніка.

На пятнаццаць працэнтаў скарочаны кіруючы апарат МУС. Адны скарочаныя пайшлі на пенсію, другія —на «месцы», а некаторым увогуле прыйшлося развітацца з органамі. Хоць апошніх вельмі нязначная частка. Нарэшце міліцыя задала сабе пытанне: а навошта міліцэйскія пагоны ўрачам, членам савета «Дынама» і іншым, якім яшчэ ў застойныя часы параздавалі міліцэйскія пагоны? Павінны ўзмацніцца крымінальны вышук, раённыя аддзелы ўнутраных спраў. У Гродна, напрыклад, стварылі аддзяленні міліцыі па мікрараёнах, і гэта дае свае станоўчыя вынікі.

Апошняе неабходна таму, што рэспубліку, ды мусіць і ўсю Садружнасць, ахапіла самая сапраўдная «эпідэмія» кватэрных і аўтамабільных крадзяжоў. Крадуць з кватэр цяпер многа і часта. А вось раскрывальнасць складае пакуль 60 працэнтаў, па ўкрадзеных машынах яшчэ горш — 50.

Рэформы закранулі і беларускую турму. Там цяпер дазволена насіць кароткія прычоскі, глядзець тэлевізар і атрымліваць пасылкі любой вагі. Не за гарамі той час, як было сказана на брыфінгу, калі нашы турмы будуць адпавядаць міжнародным турэмным стандартам.

Шчыра кажучы, у апошняе верыцца з цяжкасцю, а вось да таго паведамлення, што да начнога патрулявання прыцягваецца дывізія ўнутраных войск і асобныя армейскія падраздзяленні, даверу і нейкай удзячнасці больш. Прыемна думаць, што хоць спаць пры рынку мы будзем лепш.

Аляксандр КОКТЫШ.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

«НЯМЕЦКАЯ ХВАЛЯ»

*** У час баёў на граніцы паміж Арменіяй і Нахічаванню загінулі 17 чалавек і звыш ста паранены. Прэм'ер-міністр Турцыі Дэмірэль выключыў магчымасць ваеннага ўмяшання Турцыі ў Нахічвані. Адначасова Дэмірэль заклікаў Злучаныя Штаты Амерыкі і Расію ўмяшацца ў грамадзянскую вайну ў гэтым рэгіёне.**

*** У сераду ў выніку нападзення на аўтобус у Паўднёвай Асеціі загінулі 30 чалавек.**

*** У Тайландзе кіраўніцтва арміі патрабуе адстаўкі цяперашняга ўрада. У Бангоку і яго наваколлі працягваюцца перастрэлкі паміж вернымі ўраду падраздзяленнямі і салдатамі, якія патрабуюць звяржэння прэм'ер-міністра. Тайландскія ўлады ўвялі камендантную гадзіну, якая, аднак, не захоўваецца тысячамі дэманстрантаў.**

*** Былы міністр абароны Філіпін Фідэль Рамос апярэдзіў прыкладна на 600 тысяч галасоў другога кандыдата на пост прэзідэнта Мілян Санцьяга. Пані Санцьяга — былая суддзя — абвінаваціла ўлады ў падтасоўцы вынікаў выбараў і паведаміла аб маючых адбыцца акцыях пратесту. Філіпінскі кангрэс аб'явіць канчатковыя вынікі выбараў 25 мая.**

*** У сераду ў горад Айхор (Нізкая Саксонія) прыбылі 160 дзяцей, уражаных і суправаджаючых з пацярпеўшых ад чарнобыльскай катастрофы раёнаў Беларусі. У бліжэйшыя тыдні гасцямі зямлі Нізкая Саксонія стануць 1300 дзяцей і звыш 300 выхавацеляў і медработнікаў. Такая самая буйная ў ФРГ акцыя дапамогі дзецям з зоны Чарнобыля ў час канікулаў праводзіцца сёлета ўжо ў другі раз. Яна фінансуецца асобнымі сем'ямі, царкоўнымі арганізацыямі і зямельным урадам у Ганноверы.**

«БІ-БІ-СІ»

*** Злучаныя Штаты Амерыкі ўзмацняюць дыпламатычны ціск на Сербію. Яны забаранілі нацыянальнай авіякампаніі Югаславіі здзяйсняць пасадкі самалётаў на сваёй тэрыторыі. Тры штотыднёвыя рэйсы з Бялграда ў Нью-Ёрк і Чыкага спыніліся тут жа.**

*** Іспанскае радыё паведаміла, што паліцыя ў Барселоне выявіла амаль шэсць з палавінай тон гашышу на борце расійскага судна. Гэта адна з самых буйных партый наркотыка, выяўленых у гэтым горадзе. Судна затрымана.**

РАДЫЁ «СВАБОДА»

*** Місія Арганізацыі Аб'яднаных Нацый зноў адклала сваю паездку ў Нагорны Карабах. Цяпер гэта зроблена для таго, каб забраць груз гуманітарнай дапамогі са складаў ААН у Капенгагене. Прадстаўленыя Грэцкай транспартныя самалёты павінны ў чацвер вылецець з Афін у Ерэван з місіяй на борце. У пятніцу і суботу яна будзе ў сталіцы Арменіі, а потым накіруецца ў Нагорны Карабах. У аўторак місія завершыць сваю работу ў Баку. У выпадку неабходнасці візіт можа быць прадоўжаны.**

*** Амерыканская дабрачынная арганізацыя «Фонд Полицмана» ў Лос-Анджэлесе заснавае прэмію памяці вядомага праваабаронцы Андрэя Сахарава. Першыя прэміі на агульную суму 100 тысяч долараў будуць прысуджаны ў 1993 годзе. Прэміі імя Сахарава будуць прысуджацца людзям, якія дакажуць сваю вернасць прынцыпам сацыяльным пераўтварэнням у сваіх краінах.**

*** У мінулы аўторак адбылося адключэнне турбіны і генератара першага энергаблока Хмяльніцкай атамнай электрастанцыі. Гэта здарылася ў выніку памылковай спрацоўкі камплекта аховы ад вібрацыі на падшыпніках турбіны. Рэактарная ўстаноўка была пераведзена на панижаны ўзровень магутнасці. Праз тры гадзіны энергаблок зноў быў падключаны да сістэмы «Вінніцаэнерга». Здарэнне не аказала ўплыву на змяненне радыяцыйнай абстаноўкі на тэрыторыі АЭС і кантралюемай 30-кіламетровай зоны.**

*** Міністр абароны Расіі Павел Грачоў заявіў, што вывад расійскіх войск з тэрыторыі Арменіі і Азербайджана пачнецца 1 чэрвеня. Воінскія часці, што дыслацыруюцца ў Грузіі, застануцца там на часовай аснове. Статус расійскіх войск у Казахстане і Узбекістане будзе вызначаны ў ходзе двухбаковых перамоў. Грачоў указаў, што вывад войск з дзяржаў Прыбалтыкі можа быць завершаны ў 1994 годзе. У сераду расійскі міністр абароны прадставіў справаздачу сфарміраванаму ў мінулым месяцы Савету бяспекі Расіі.**

*** Пасля заканчэння ў Лісабоне канферэнцыі па аказанню дапамогі былым рэспублікам СССР дзяржаўны сакратар ЗША Джэймс Бейкер наведае Грузію. Ён сустрэнецца са старшынёй Дзяржаўнага Савета Грузіі Эдуардам Шэварднадзе. Выступаючы па мясцоваму тэлебачанню, Шэварднадзе заявіў, што эканоміка рэспублікі знаходзіцца на мяжы катастрофы, а першачарговай задачай улад з'яўляецца папярэджанне голаду.**

*** Прэзідэнт Францыі Франсуа Мітэран і канцлер ФРГ Гельмут Коль падпісалі ўчора дагавор аб стварэнні да 1995 года сумеснага франка-германскага армейскага корпуса колькасцю 35 тысяч чалавек. Цяпер існуе франка-германская брыгада, якая налічвае 4 тысячы вайскоўцаў.**

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ●

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

ПЕРАТВАРЭННЕ «КНЯЗЯ ЦЕМРЫ»

Былы памочнік міністра абароны ЗША, які заслужыў мянушку «князя цемры» за свае антысавецкія погляды, нечакана ператварыўся ў прыхільніка сённяшняга расійскага кіраўніцтва. Цяпер ён выконвае абавязкі саветніка па канверсіі пры адным з буйнейшых абаронных прадпрыемстваў Расіі.

ЭЛІТА «ІНШАЗЕМНАГА ЛЕГІЁНА»

Палкоўнік Фрамажэ, што ўзначальвае мабілізацыйны аддзел французскага «іншаземнага легіёна», ніяк не можа нахваліцца добраахвотнікамі з Расіі і іншых краін СНД. «Гэтыя хлопцы, у многіх з якіх за плячыма вопыт Афганістана, — гаворыць палкоўнік, — мужныя, валодаюць баявой кемлівасцю, звыклыя да спартанскага ладу жыцця, адразу ж выконваюць загады і натхнёныя жаданнем застацца на Захадзе — адным словам, гэта для нас ідэальны матэрыял».

О, ВЯЛІКАЯ І МАГУТНАЯ РУСКАЯ МОВА

Сур'ёзныя меры супраць асоб, што нецэнзурна лаюцца, прадугледжаны загадам кіраўніка адміністрацыі казахстанскага горада Руднага. Нецэнзурнае слова ў грамадскім месцы цяпер абыдзецца ў 1.000 рублёў. Калі няма грошай, штраф будзе заменены адміністрацыйным арыштам на 15 сутак. «Непапраўныя» будуць накіроўвацца на прымусовыя работы тэрмінам ад месяца да двух з утрыманнем 20 працэнтаў заробку.

ТЭЛЕВІЗАР — ЛЕПШАЕ СНАТВОРНАЕ!

У ходзе масавага апытання жыхароў ФРГ выявілася, што 58 працэнтаў апытаных засынаюць каля тэлевізара.

Васіль НАЙДЗІН

ДЗЕНЬ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА

Урыўкі з аповесці

(Заканчэнне. Пачатак у № 100).

— Разбяруцца! — супакойваў ён сам сябе, вяртаючыся ў той вечар з выцвярэзніка — падумаць толькі, з выцвярэзніка! — дамоў.

— Кладзі ты на ўсё болт! — моцна паціснуў яму пры развітанні руку Раман.

— І спі спакойна,— падбадзёрыў Сяргей.— У любым выпадку — замочым!

***

У тое, пра што расказаў Валянцін, жонка паверыла адразу. І супакоіла як магла:

— Не бяры да галавы...

— А калі выключаць... З маёй партыі. Нялоўка неяк...

— Ну што яна табе дала, партыя?

Валянцін ускіпеў:

— Усё!.. І мне, і ўсяму чалавецтву. Гэта ж — авангард! Пралетарскую рэвалюцыю здзейсніла. Накарміла народ, напаіла...

— Вось іменна. А потым сказала — канчайце піць! Добра яшчэ было б, каб не елі...

У Валянціна адняло мову. А жонка дабівала:

— Мабыць, і ты рулявы?.. Ні дачы, ні машыны. Кватэру займелі на свае кроўныя. Ды нам бы хоць машыну пральную. Ды штаны табе... Нічога нідзе няма. Затое на твае ўзносы начальства шыкуе.

Ён вырашыў павярнуць размову ў другі бок.

— Дурніца ты мая. Я ж восем гадоў запар у пераможцах сацыялістычнага спаборніцтва хаджу. А тут — выкінштэйн з партыі! Ты што?!.

— Граматы яшчэ падлічы, якімі цябе, дурня, адорвалі. Абклей імі сцены...

У Валянціна была добрая звычка ніколі з жонкай не ісці на абвастрэнне. І наогул многія лічылі, што ў яго мяккі характар.

— Канчаем канфрантацыю,— сказаў ён.— Думаю, усё ўлічаць.

— І пра партрэт, што на заводскай Дошцы гонару ці на той алеі Славы вісіць, сказаць не забудзься. Якога гэта ён памеру?

— Два метры ў шырыню і тры—у вышыню... Партыя рабочага чалавека ў бядзе не пакіне.

***

На ўсё жыццё запомняцца яму гэтыя сходы, пасяджэнні бюро, камісій розных па разборы яго персанальнай справы. Атрымлівалася нешта неверагоднае. Ён, выходзіла, распіваў спіртныя напіткі прама на вуліцы, пры затрыманні аказаў «злоснае супраціўленне» работнікам міліцыі, быў дастаўлены ў выцвярэзнік...

— Разумныя вы, хлопцы, ці не?—запытаў Валянцін па-прасяцку тых, з кім не адзін год працаваў разам.—І Сяргей з Раманам не вінаватыя. Піва з цюлькай пачалі піць. А тут міліцыянеры, яршыстыя...

Асобныя ўжо выказваліся ў яго абарону. Астатнія сядзелі, нізка апусціўшы галовы, чакаючы галасавання.

Сакратар партыйнай арганізацыі выступіў апошнім. Ён нацэліў прысутных на правільныя дзеянні:

— Мы ўсё, таварыш Рубанюк, разумеем. Спачуваем, перажываем. Але любое дачыненне, няхай сабе і дробязнае, да гэтай справы... прабачце, да п'янства і алкагалізму, павінна караецца самым суровым чынам.

— Дык што ён, вораг народа? Ці партыі нашай?—запытаўся нехта смелы з задніх радоў.— Калі б нават і выпіў грамаў сто. Такой бяды!..

— Абмяжуемся сёння разборам адной справы,— кінуў рэпліку інструктар райкома партыі, які сядзеў у прэзідыуме.— Вы прымайце сваё рашэнне, а мы прымем — сваё. Дарэчы, нас таксама могуць паправіць. Ёсць яшчэ гарком, ёсць абком. І ЦэКа!

Заводскія камуністы прагаласавалі за вымову. Простую, нават без занясення ва ўліковую картку.

— Тым горш для яго,— сказаў на развітанне раззлаваны госць.— Да сустрэчы на пасяджэнні бюро райкома партыі...

***

...Абмеркаванне яго пытання на пасяджэнні бюро райкома партыі, можна лічыць, ужо завяршалася.

Прагаласаваўшы, апусцілі галовы члены бюро.

Першы сакратар узняўся са свайго месца, паправіў гальштук і зашпіліў на ўсе гузікі пінжак:

— Большасцю галасоў вы выключаны з партыі. Здайце партбілет...

Рубанюк глядзеў на членаў бюро, на сакратара і не мог уцяміць, што яму цяпер рабіць.

— Вы... вы што, таварышы?!

— Якія мы цяпер табе таварышы,— адзін з членаў бюро злёгку пастукаў алоўкам па стале.—Параспіваліся! Замест таго, каб яшчэ лепш працаваць...

— Грамадзяне!..— вырвалася ў Рубанюка.— Працую ж... А пасля работы ўзялі мы пяць бутэлек...

— Ну, досыць. Справа закончана, прагаласавалі ўсе... У турму ж вас не садзяць, узнагароды — пры вас. Працуйце як працавалі. Білет толькі здайце,— першы сакратар набліжаўся да яго.

Кроў ударыла Рубанюку ў галаву і адтуль з хуткасцю маланкі пайшлі каманды ва ўсе часткі цела. Далей рабілася ўсё неяк само сабой. Ён напружыўся, рашуча зрабіў два крокі наперад і саўгануў першаму пад самы нос кукіш.

— Не аддам партбілет! Са мной застанецца...

Выбягаючы ўжо з залы, ён пачуў вокліч:

— Міліцыю! Хутчэй выклікайце...

— Уцячэ, прахвост...

Ён не памятае, як збягаў з трэцяга ці чацвёртага паверха па мармуровых прыступках, як унізе, у вестыбюлі, ледзь не пераблытаў дзверы з акном.

***

Жонка сустрэла яго моўчкі.

На твары мужа прачытала навіну.

— Вось так!..— паглядзеў ён у сумныя вочы сваёй Валянціны.— Ледзь зноў не забралі. Каб крыху затрымаўся — заграблі б... Сутак на пятнаццаць. Ці наогул — на год. Яны могуць... Але білета я ім не аддаў.

Ён пайшоў на кухню, адкрыў халадзільнік. Дастаў адтуль бутэльку гарэлкі і паставіў на стол.

— Алкаголікам зрабілі!..— Валянцін прысеў на ўслонік уласнай вытворчасці і схіліў долу галаву.— Яршы зялёныя!.. І я ім ужо — не таварыш.

Падышла Валянціна. Асцярожна паклала на яго галаву руку. Пакратала жорсткія валасы і ён адчуў, як у жонкі дрыжаць пальцы.

— Нічога, Валік, пражывём.

— Не вешацца ж...— пацягнуў ён думку жонкі далей.— А то зусім засмяюць. І дзецям — пляма на біяграфію. Маўляў, напіўся бацька і павесіўся. Пасля таго, як выключылі з партыі. За п'янку...

Неўзабаве, як і трэба было чакаць, завіталі Сяргей з Раманам.

«Павіншавалі» коратка і ясна. Сяргей запэўніў, што ў хуткім часе падыме ў цэху бунт. Потым, па яго ініцыятыве, уздыбіцца завод. Падтрымае і горад.

— Навошта рэвалюцыя,— Валянцін адкаркаваў бутэльку.— Была ўжо... І не адна. Ну, выключылі. Адным менш, другім — больш. Раней не такія чысткі рабілі.

— Я не пра цябе. Жывём жа з кожным днём ўсё горш і горш. Ні апрануцца, ні абуцца... А наконт выключэння з партыі ты не перажывай. Папросяць яшчэ назад. Хто гегемоны? Мы!..

— Вось іменна! — уключыўся ў размову Раман.— Папросяць. Два планы ім давай! «Арганізуем трохэменку, папрацуем у суботу...» А дулю пад нос! Піўка не дазваляеце пасля работы выпіць...

Выпілі.

Закусілі.

Пайшлі на паўтор...

— Хочаце, я вам зараз пачытаю верш аднаго разумнага чалавека,— звярнуўся да сяброў Валянцін.— Сіла верш!

Валянцін адлучыўся кудысьці на пару хвілін і вярнуўся на кухню з запісной кніжкай. Пагартаў яе, знайшоў патрэбную старонку.

— Пачнём?

— Давай...

І Валянцін пачаў чытаць.

«Живем духовно, безгреховно,
Отнюдь не безидейно,
Да только больно уж морковно,
Безмясно, безидейно.
Соблазнам всем противясь стойко,
Боюсь, как бы с годами-то
Не превратились мы в надстройку
Без всякого фундамента,
А если мыслить по-марксистски,
То, не давая Маху,
Порою надо жрать сосиски
И принимать рюмаху».

Сяргей з Раманам запляскалі ў ладкі.

— Такія вершы я слухаў бы дзень і ноч. А хто гэта ёмка так напісаў? — Раман вачамі паказаў на блакнот. І паглядзеў на Валянціна:— Не ты, не?

— Ёсць геній. Канстанцін Сіманаў. 1974 год.

— А ты не маніш?

— Сам з часопіса перапісаў,— Валянцін паклаў сваю запісную кніжку на чысты край стала.— Вось, пазначана: «Дружба народов», № 2, 1980 год». Магу прынесці. Ён у мяне схаваны.

— Няўжо выпісваеш? — Сяргей са здзіўленнем паглядзеў на Валянціна.

Валянцін узяўся за недапітую бутэльку.

— Гэта разальём і паставім кропку. Бо няма прычын для весялосці...

«ІДЗІ Ж, НАРОДЗЕ ЎВАСКРЭСЛЫ!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Нязгасная лампада — на плошчы Незалежнасці. Высока і чыста гучаць духоўныя спевы. На душы і праўда светла — няма штурханіны і крыку, хоць людзей сабралася вельмі многа. Затое шмат ветлых, прыязных твараў, кветак. Хораша гаворыць да высокай місіі, да ўсіх людзей Станіслаў Шушкевіч, Аляксандр Герасіменка, мітрапаліт Філарэт. Пра тое, каб агонь духоўнасці, які на працягу многіх вякоў цепліўся ў людскіх сэрцах, не згас у сэрцах беларусаў, усіх славян, усіх людзей. Каб ён абудзіў у нас любоў да Бога, адзін да аднаго, каб пераплавіў усё нядобрае, уваскрэсіў душы.

Потым усе ідуць хрэсным ходам да Свята-Духава кафедральнага сабора — па праспекце Скарыны, потым па вуліцы Кірылы і Мяфодзія. Чыстыя гукі званоў клічуць людзей да храма.

І зноў гучыць Слова — царкоўнае і свецкае. І зноў мы пераконваемся, што Слова больш хутка і надзейна заваёўвае сэрцы, чым сіла, прымус. Сярод мноства святарскіх галасоў, якія правяць службу, людзі пазнаюць настаяцеляў сваіх храмаў.

— Айцец Георгій чытае, —з гонарам паведамляе суседзям жанчына.

Голас айца Георгія сапраўды цяжка не пазнаць— евангельскае слова гучыць па-беларуску, што пакуль даволі нязвыкла для беларускай праваслаўнай царквы. Але менавіта роднае слова дапамагло захаванню нацыі, гаварыў да людзей прадстаўнік з Балгарыі — радзімы Кірылы і Мефодзія. І нам не ўзнята без гэтага да вышынь духоўнасці, напамінае людзям Ніл Гілевіч. Роднае слова дапаможа душы ўваскрэснуць, прабіцца да святла.

...А ў саборы гэтым часам гаснуць усе свечкі, каб праз хвіліну загарэцца ад агню Нязгаснай лампады, прынесенай з Іерусаліма. Людзі падрыхтавалі свечкі, каб панесці часцінку Святога агню ў сваё жытло, у свае сем'і.

Няхай там пасвятлее.

Людміла РЫЖАНКОВА, Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

Рэцэпты Маі Гагулан

Чатыры дні ў Мінску выступала Мая Гагулан—масквічка, якая перамагла ў сабе смяротную хваробу, выкарыстоўваючы арыгінальную методыку японскага прафесара Нішы. Зараз яна нясе веды людзям — пра здароўе, рацыянальнае харчаванне. Яе дэвіз — карміць арганізм, а не хваробу, г. зн. не ўжываць нічога лішняга, штучнага, сапсаванага няправільнай апрацоўкай. Яна раіць есці пераважна сырыя прадукты расліннага паходжання, не ўжываць цукру, алкаголю, тытуню, кавы, смажанага мяса, спецый і г. д. Вось некаторыя яе рэцэпты.

САЛАТА ПРЫГАЖОСЦІ. Сталовую лыжку тварагу добра перамяшаць з дзвюма сталовымі лыжкамі сыраквашы ці кефіру, дадаць чайную лыжку алею. Гэта будзе аснова. Дадаём да яе любы жывы прадукт — агародніну, садавіну, зяленіва, але каб па аб'ёму было ў тры разы больш, чым асноза. Можна браць капусту, яблыкі, апельсін, моркву, розныя віды лісцевых салатаў і г. д. Калі на працягу месяца адзін раз у дзень ужываць такую страву (вядома, пазбягаючы ў астатнім харчаванні празмернасцей) — выдатна ачысціцца печань, а значыць, памаладзее ўвесь арганізм.

«ЖЫВЫ» БОРШЧ. Закіпяціць невялікую колькасць вады і засыпаць туды здробненую на тарцы ці дробна парэзаную агародніну (капуста, буракі, морква, цыбуля, пятрушка і г. д. — што ёсць). Крыху пасаліць. Варыць усяго некалькі мінут. Адначасова закіпяціць сыроватку (у 3 разы больш, чым вады) і ўліць у «агароднінную кашу». Захутаць на 1,5 гадзіны. Разліць у талеркі, заправіць зяленівам, смятанай, свежым памідорам ці «храновінкай» (гл. ніжэй). Па гэтаму ж прынцыпу гатуюцца ўсе супы (зварыць бульбу, крупы, астатняе — сырое). Карысна дадаць у страву дробна парэзанае бацвінне рэпы, радыску, крапіву, дзьмухавец.

«ЖЫВАЯ» КАША. Тры сталовыя лыжкі аўсяных круп змалоць на кавамолцы, дадаць паўшклянкі вады, паставіць у цёплае месца (можна на ацяпляльную батарэю). Праз паўгадзіны дадаць чайную лыжку алею і дробна парэзаны яблык. Каша гатова. Усе прадукты захаваюць сваю каштоўнасць.

БУЛЬБЯНЫЯ «ПІРОЖНЫЯ». Бульбіны добра памыць, разрэзаць капалам і пакласці ў духоўку — разрэзамі ўверх, запячы. Можна есці і так, а можна паліць соусам (тоўчаны арэх, часнок, смятана; альбо смятана, часнок, дробна парэзанае зяленіва). Замест смятаны можна выкарыстаць маянэз, але лепш — хатняга прыгатавання (смятана, яблычны воцат, гарчыца, яечны жаўток).

ПРЫПРАВА «ГЮРЗА». 1 кг свежых памідораў змалоць на мясарубцы, крыху пасаліць, дадаць 300 г часнаку, таксама прапушчанага праз мясарубку. Закрыць поліэтыленавай накрыўкай і паставіць у халоднае месца. Можна дадаць 300 г падрыхтаванага такім жа чынам балгарскага перцу. З такой прыправай любая страва будзе вельмі смачнай, а да ўсяго ўзбагачанай мікраэлементамі, якіх багата і ў памідорах, і ў часнаку.

Разнавіднасцю «гюрзы» з'яўляецца «храновінка» (1 кг памідораў +300 г часнаку + 300 г хрэну. Можна дадаць 300 г кіслых яблыкаў). Усё здрабняецца праз мясарубку і раскладваецца ў слоікі. У любую пару года гэта дапаможа мець паўнацэннае харчаванне.

ЯК ЗРАБІЦЬ З ЦУКРУ СЯБРА, А НЕ ВОРАГА

750 г цукру (яшчэ лепш, калі змалоць яго на кавамолцы) засыпаць у літровы слоік і дадаць шклянку (200 г) вады і 200 г мёду, апошнія кампаненты папярэдне перамяшаць. 8 дзён запар тройчы ў дзень перамешваць драўлянай лапаткай. На 9-ы дзень прадукт гатовы—цукар ператвараецца ў фруктозы, няшкодны для арганізма.

А вось прадукты, якія, на думку Маі Гагулан, трэба абавязкова ўжываць тым, хто жыве на забруджаных радыяцыяй тэрыторыях.

Морква (не менш дзвюх морквак у дзень), алей, тварог, гранаты, разынкі, чарнасліў (не больш пяці штук у дзень), сок буракоў, моркві, крапіва, чарнаплодная рабіна, ільнянное семя (талакно), вітамінны чай, вітаміны, а таксама ўсе прадукты, якія ўтрымліваюць кальцый (зялёная агародніна, капуста, буракі, цыбуля, клубніцы, кісламалочныя прадукты, лісты дзьмухаўцу (у тым ліку і сушаныя) і г. д.

Стравы з казінага малака

ДАМАШНІ СЫР

З казінага знятага ці прасепарыраванага малака зрабіце сыраквашу. Знятае малако падагрэйце да 33° С ці дадайце сыраквашу ў знятае малако.

Атрыманы прадукт патрымайце на невялікім агні 15 мінут. Як толькі сыроватка падымецца па краях, злёгку памяшайце. Маса павінна быць зеленавата-празрыстай. Пры павышэнні тэмпературы сыроватка стане больш шчыльнай. Цяпер памешвайце яе энергічней (мінут 15), пакуль тэмпература падымецца да 40° С (але не вышэй), інакш тварог атрымаецца жорсткім, сухім, ці, наадварот, будзе надта вадкім. Пасля гэтага масу змясціце ў палатняны мяшок і падвесце ці пакладзіце пад прэс, а калі вадкасць сцячэ, дабаўце солі, кмен ці часнок і замясіце рукамі, пакуль не атрымаецца цеста без камякоў, якое добра фармуецца. З яго зрабіце некалькі сыроў (лепш размерам 6—7 сантыметраў) і ненадоўга пакіньце ў добра праветраным памяшканні, на саломе. Пасля сушкі вынесіце ў цёплую сырую камору, кладоўку, дзе на 14-ы дзень на сыры ўтворыцца скарынка. У гліняным гаршчочку пад марляй ён захоўваецца да чатырох месяцаў.

РАКФОР

Малако падагрэйце ў гліняным ці бляшаным посудзе, на наступны дзень раніцай здыміце з яго смятанку, змяшайце са свежым ранішнім малаком і заквасьце. Атрыманы тварог, аддзяліўшы яго ад сыроваткі, пакласці ў формы (у 3 слаі), перасыпаць кожны слой сухім цвілым хлебам (для ўтварэння пражылак унутры сыру). Прыціснуць будучы сыр на некалькі дзён грузам. Штодзень формы з сырам паварочваць. Затым зняць формы і праветрыць сыр у халаднаватым месцы.

Далей сыры «спеляць». Натрыце іх соллю і пакладзіце адзін на адзін, а затым ачысціце ад паверхневай цвілі і мяккага верхняга слоя. Праз 7—8 дзён аднясіце ў падвал. Тут сыры набудуць жоўтую і чырванаватую афарбоўку, пакрыюцца слоем белай цвілі. Гэту цвіль здымайце кожныя 8—14 дзён да поўнага выспявання.

Сам сабе метэаролаг

Кожны тыдзень перад выхаднымі днямі шматлікая армія дачнікаў, аматараў адпачынку «на прыродзе», турыстаў, ды і гараджан, якія нікуды не збіраюцца ехаць, але плануюць свой адпачынак, з асаблівай цікавасцю чакаюць прагнозаў метэаролагаў, якія перадаюць радыё і тэлебачанне, друкуюць газеты.

Між тым, кожны можа самастойна скласці даволі дакладны прагноз надвор'я на бліжэйшыя дні і нават гадзіны. Трэба толькі, каб пад рукой быў барометр і тэрмометр. А таксама веданне прызнакаў яснага і непагодлівага надвор'я, або набліжэння перамены надвор'я.

Сёння мы раскажам пра ПРЫЗНАКІ УСТОЙЛІВАГА ЯСНАГА НАДВОР'Я.

● На працягу некалькіх дзён высокі атмасферны ціск паволі і няспынна павышаецца або застаецца нязменным.

● Правільны сутачны ход тэмпературы паветра ў летні час: днём горача, ноччу ядрана і халаднавата; узімку: ноччу моцны мароз, днём ён слабее, к ночы зноў узмацняецца, ноччу ў лесе значна цяплей, чым у полі; на ўзгорку або ўзвышшы цяплей, чым унізе.

● Неба зусім яснае і бязвоблачнае. Вясной, летам і восенню могуць узнікаць кучавыя воблакі, якія павялічваюцца ў пасляпаўдзённы час і знікаюць (таюць) к вечару. Іх яшчэ называюць кучавымі воблакамі добрага надвор'я. Воблакі плывуць па небу ў тым жа напрамку, у якім дзьме вецер ля паверхні зямлі. Часам з самай раніцы бачныя высокія перыстыя воблакі, якія здаюцца нерухомымі і знікаюць к вечару.

● Ападкаў няма. Ноччу выпадае густая раса (узімку — шэрань). Раса неўзабаве пасля ўсходу Сонца хутка высыхае.

● У лагчынах і нізінах вечарам і ноччу ўтвараецца туман. Раніцай пасля ўсходу Сонца ён расходзіцца. Зара залацістая або ружовая. Зеленаватая зара прадказвае надыход доўгага засушлівага перыяду надвор'я. Узімку жаўтаватакарычневая зара бывае звычайна перад працяглымі моцнымі марозамі. Дым слупом узнімаецца ўверх. Вянцы (але не кругі) ў воблаках каля Месяца—вялікага памеру. Зоркі мігцеюць слаба і паблісваюць зеленаватым светам. Ластаўкі і стрыжы лятаюць высока. У асенні перыяд лятае шмат павуціння.

Усё гэта прызнакі ўстойлівага яснага надвор'я.

ПРАГРАМА ТЭЛЕПЕРАДАЧ

ПАНЯДЗЕЛАК

25 мая

Беларускае тэлебачанне

16.30. Навіны.
16.35. Экран дзіцячага фільма. «Матрос Чыжык».
18.00. Статак выйшаў на пашу. Перадача з Брэста.
18.20. Дак. фільм «Хай б'юць мяне — дужэйшым буду».
19.00. Абласныя навіны (Брэст).
19.10. Наш каментарый. «Пра кепскі мір і добрую сварку».
19.20. Тэлевізійны Дом кіно. Частка 1-я.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Спартыўны тэлекур'ер.
21.45. Тэлевізійны Дом кіно. Частка 2-я. Мастацкі фільм «Дрэнь».
23.15. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Навіны.
5.20. Ранішняя гімнастыка.
5.30. Раніца.
7.50. Ранішняя гімнастыка.
8.00. Навіны.
8.20. Дак. фільм «На Кіпры добрае надвор'е».
8.50. Мультфільмы «Алдар Касе», «Дзень добры, цётка Лісаі»
9.15. Маст. фільм «Садко».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
13.10. Талемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Гэта было, было....
14.40. «Прадаецца мядзведжая шкура». Маст. фільм.
15.45. Адкрыццё мастака пратаіерэя Стэфана Дамусчы.
16.05. «Чароўны смык». Мультфільм.
16.15. Разам з чэмпіёнамі.
17.00. Навіны.
17.25. Актуальны рэпартаж.
17.35. НЭП.
18.05. Футбольны агляд.
18.35. Маст. фільм «Запіскі юнага ўрача».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «Новая студыя» прадстаўляе: «ТВ—галерэя», «Бамонд», «АТБ—брокер». У перапынку — Навіны.
24.00. «Прадаецца мядзведжая шкура». Маст. фільм.
1.05. «М. І. Глінка. Рамансы».

Канал «Расія»

17.00. «Еўропа — Азія».
17.50. «Дзіцячыя мары». Шматсерыйны фільм (Францыя). 4-я серыя.
18.10. Тварам да Расіі.
18.25. «На задворках Расіі». Перадача 2-я.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара». 48-я серыя.
20.20. Студыя «Рэтра».
20.45. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.25. Пятае кола (працяг).
23.00. «Ралан Гарас». Адкрыты чэмпіянат Францыі па тэнісу.

26 мая

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
9.15. «Дзяўчаты». Маст. фільм.
16.30. Навіны.
16.35. Для дзяцей. «Тое-сёе з паштовай сумкі».
17.10. Мультфільмы.
18.00. Дак. фільм «Перааддаленне».
18.10. Якія мы гаспадары? Мінскае вытворчае аб'яднанне «Гарызонт».
18.55. Тэлеаўкцыён запрашае...
19.00. Абласныя навіны (Віцебск).
19.10. Наш каментарый. «Суседзі».
19.15. Прыватызацыя жыллёвага фонду. Прэс-канферэнцыя ў Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.
20.10. Дыялог.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Дзяўчаты». Мастацкі фільм.
23.15. НІКа.
23.30. Галасы стагоддзяў. Фальклорная праграма.

І канал. Астанкіна

5.00. Навіны.
5.30. Раніца.
8.00. Навіны.
8.50. «Выкрадальнікі фарбаў». Мультфільм.
9.10. Маст. фільм «Асенняя званы».
10.30. Музей на Дэлегацкай. «Свет адлюстраваны».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
13.35. Свет грошай Адама Сміта.
14.00. Навіны.
14.20. «Танцы вакол паравога катла». Маст. фільм. 1-я серыя.
15.25. С. Пракоф'еў. Канцэрт № 3 для фартэпіяна з аркестрам.
15.55. Фільм — дзецям. «Ляці, жураўлік».
17.25. Сельскія хронікі.
18.00. Авіякасмічны салон.
18.15. «Зямны круг». Паэзія Сяргея Маркава.
18.35. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
19.00. Тэма.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.35. Маст. фільм «Жаданне перамагчы» (Італія). 1-я серыя.
22.00. Фермата.
22.20. Ведзі.
23.25. «50×50». Тэлешоу.
0.55. «Танцы вакол паравога катла». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Французская мова. 1-ы год навучання.
7.55. Вольны час. «Птушкі побач з намі».
8.10. Французская мова. 2-гі год навучання.
11.20. Калі вам за...
11.50. «Санта-Барбара». 46-я серыя.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. Прастора плюс.
15.45. Студыя «Рост». «Тон-лабірынт».
16.15. Ключ да сусветнага рынку.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Тэлеагляд «Далёкі Усход».
17.45. Ключ.
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Апазіцыя.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Смешныя гісторыі. Сам сабе рэжысёр».
20.00. «Лікбез для мудрацоў».
20.30. Інфармацыйна-аналітычная праграма «Люстэркі».
21.00. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
21.30. Дзелавы кур'ер.
21.45. Экран крымінальных паведамленняў.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. Аўта-шоу.
23.00. «Ралан Гарас». Адкрыты чэмпіянат Францыі па тэнісу.
23.30. Аўта-шоу (працяг).

АЎТОРАК

27 мая

СЕРАДА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Студыя «Мэта». Дом кіно.
11.30. «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка». Маст. фільм.
16.30. Навіны.
16.35. Экран дзіцячага фільма. «Гора баяцца — шчасця не бачыць». 1-я серыя.
17.40. «Чэмпіён у лесе». «Пластыліновая варона». Мультфільмы.
18.10. «Вяртанне музыкі, ці Царністы шлях Міколы Равенскага».
19.00. Абласныя навіны (Гомель).
19.15. Роднае слова. Тэлечасопіс.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка». Маст. фільм.
23.05. НІКа.
23.20. Міжнародны турнір па армрэстлінгу «Брэст-92».

І канал. Астанкіна

5.00. Навіны.
5.30. Раніца.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
8.45. «Аднойчы... сустрэліся...». Група пантамімы пад кіраўніцтвам А. Кірушкіна.
9.15. Маст. фільм «Пасля дожджыку, у чацвер...».
10.35. Дак. фільмы: «Тут, пад антычным небам Танаіс», «Дрэздэн. Тры старонкі».
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
13.10. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.25. Сёння і тады.
14.55 «Танцы вакол паравога катла». Маст. фільм. 2-я серыя.
16.00. «Рок макс».
17.00. Навіны.
17.25. «Заложнікі». Тэлерамыс.
17.55. «Вось такі рассеяны». Мультфільм.
18.05. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
18.30. Кінапанарама.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.40. Маст. фільм «Жаданне перамагчы». 2-я серыя.
22.20. «Чорная скрыня».
22.50. «Злачынства лорда Артура Сэвіла». Мультфільм для дарослых.
23.00. Навіны.
23.25. «Лімпапо».
23.55. Джазавыя партэты.
0.50. «Танцы вакол паравога катла». Маст. фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Вестка.
7.25. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
7.55. Вольны час. «Дамашні клуб».
8.10. Нямецкая мова. 2-гі год навучання.
8.40. Студыя «Рост».
10.25. Момант ісціны. На пытанні А. Каравулава адказвае мітрапаліт Валакаламскі і Юр'еўскі Піцірым.
11.20. Педагогіка для ўсіх.
11.50. «Санта-Барбара». 47-я серыя.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00—13.20. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. «Кіно ўчора і сёння». Перадача 2-я.
15.55. Рускі скульптар Фядот Шубін.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. «Каўказ-рэвю».
17.45. Версія.
18.10. «Цёплы дом». Аб сямейных дзіцячых дамах.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Санта-Барбара». 49-я серыя.
20.20. Экспацэнтр прадстаўляе...
20.25. Экран крымінальных паведамленняў.
20.35. На спектаклі «А што гэта ты ў фраку?» Па п'есе-жарту А. П. Чэхава «Прапанова».
22.00. Весткі.
22.25. На сесіі ВС Расіі.
23.00. «Ралан Гарас». Адкрыты чэмпіянат Францыі па тэнісу.

28 мая

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Час адзіноты». Маст. фільм.
16.30. Навіны.
16.35. Экран дзіцячага фільма. «Гора баяцца — шчасця не бачыць». 2-я серыя.
17.40. Для школьнікаў. «Веснавая навела». Па вершах беларускіх паэтаў.
18.10. Сустрэча для вас. Нашы госці — пагранічнікі Беларусі розных пакаленняў. Прамая лінія.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. Тры кіты. Мастацка-публіцыстычная праграма.
20.20. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Справа выпадку.
21.30. Студыя «Сэнс» у Слонімскім раёне.
23.00. Спявае С. Данілюк.
23.40. НІКа.

І канал. Астанкіна

8.20. «Багатыя таксама плачуць».
8.45. «Лімпапо».
9.15. Маст. фільм «Агонь, вада і... медныя трубы».
10.40. «Следства вядуць Калаблкі». Мультфільм. 1-я — 4-я серыі.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
13.10. Талемікст.
14.00. Навіны.
14.25. «Памылка Тоні Вендыса». Маст. фільм. 1-я серыя.
15.30. У свеце матораў.
16.00. «Казка пра згублены час». Мультфільм.
16.20. «440 герц». Музычная перадача для падлеткаў.
17.25. ...Да 16 і старэйшым.
18.05. «Служэнне муз не церпіць мітусні». Васіль Лівановаў учора і сёння.
18.35. «Багатыя таксама плачуць». Маст. фільм.
19.05. Тэлескоп.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Жаданне перамагчы». 3-я серыя.
22.10. Музыка ў эфіры. Частка 1-я.
23.00. Навіны.
23.20. Музыка ў эфіры. Частка 2-я.
0.30. «Памылка Тоні Вендыса». Маст. фільм. 1-я серыя.

Канал «Расія»

7.25. Іспанская мова. 1-ы год навучання.
7.55. Вольны час. «Увага: здымаю».
8.10. Іспанская мова. 2-гі год навучання.
11.50. «Санта-Барбара». 48-я серыя.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. У свеце жывёл.
16.15. Тэрмінал.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Бізнес і палітыка.
18.15. Студыя «Нотабене».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спецыяльны камерцыйны веснік.
19.40. «Казіно-шоу».
20.30. «Хрона». У свеце аўтамотаспорту.
21.00. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
23.00. Пятае кола (працяг).

ЧАЦВЕР

29 мая

ПЯТНІЦА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Сцеражыся аўтамабіля!». Маст. фільм.
16.30. Навіны.
16.35. «Кракакот», «Аднойчы ў пустыні», «Вяртанне Дамавічка», «Цінка-павуцінка». Мультфільмы.
17.15. Для школьнікаў. Голас. Літаратурна-мастацкі відэаканал.
18.00. Дак. фільм «Песня жытнёвага поля».
18.15. Факты і меркаванні.
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Прафсаюзы: праблемы, каментарыі.
19.30. Новы век, Васіль Раінчык прадстаўляе...
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. Тэлеаўкцыён запрашае...
21.45. «Сцеражыся аўтамабіля!» Маст. фільм.
23.20. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Навіны.
5.30. Раніца.
8.00. Навіны.
8.20. «Багатыя таксама плачуць».
8.45. Мультфільмы.
9.15. Маст. фільм «Хлопчык-з-пальчыка».
10.40. «Грыбное паляванне». Навукова-папулярны фільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
13.10. Брыдж.
13.40. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
14.20. «Памылка Тоні Вендыса». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.25. «Дуэль». Пра прэзідэнта Чэчанскай Рэспублікі Дудаева.
16.00. «Вобраз». Літаратурная перадача для старшакласнікаў.
17.00. Навіны.
17.25. Чалавек і закон.
18.00. ТБ «Нява».
18.20. Фільм дзецям. «Эміль з Ленеберга» (Швецыя) 6-я серыя.
18.45. Дак. фільм «У чаканні прышэсця».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. ВІД прадстаўляе: «Поле цудаў». «Матадор». «Шоу-біржа». У перапынку (23.00) — Навіны.
0.15. «Гукавая дарожка».
0.45. «Памылка Тоні Вендыса». Маст. фільм. 2-я серыя.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Англійская мова. 1-ы год навучання.
8.50. Вольны час. «ТБ—атэлье».
9.05. Англійская мова. 2-гі год навучання.
11.50. «Санта-Барбара». 49-я серыя.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. Першы тайм.
15.30. «Кіно ўчора і сёння».
15.45. Трансрасэфір.
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Паралельныя светы.
17.45. М-трэст.
18.00. Так і жывём.
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Залатая шпора.
19.50. «Маналог». Мастацкі фільм.
22.00. Весткі.
22.20. Вячэрні салон.
23.00. Адкрыты чэмпіянат Францыі па тэнісу.
23.30. Вячэрні салон (працяг).

30 мая

СУБОТА

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Аўтаспорт». Ёсць на МАЗе каманда...
9.30. «Угледзьцеся ў твар...». Аўтарская песня Юрыя Бельскага.
10.00. Паказвае Віцебск. Дзвіна.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Студыя «Мэта». Браты Ермаловічы.
12.15. 20 мінут рэдактара.
12.35. Гамбіт. Шахматны клуб.
13.05. Перапрацоўка і ўтылізацыя таксічных адыходаў.
13.45. «Суперкніга». Мультфільм. 4-я серыя.
14.20. ПІК.
15.10. «Камерата» і польскі ансамбль «The willows revival singers».
15.55. Адраджэнне. Частка 1-я.
16.40. Шанц. Шоу-гульня.
17.55. Футбол. «Дынамо» (Мінск) — «Тарпеда» (Магілёў).
19.50. Процістаянне. Маральна-прававая праграма
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.40. «Сінема» прадстаўляе: мастацкі фільм «Сальвадор» (ЗША) 1-я серыя.
22.50. НІКа.
23.05. Футбол-92. Вынікі тура.
23.20. «Падарунак з Францыі». Музычная праграма.

І канал. Астанкіна

6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.40. Спорт для ўсіх.
8.10. Як дабіцца поспеху.
8.25. «Бумеранг».
9.00. Радыё «Труба». Забаўляльная праграма.
9.30. Цэнтр.
10.10. Музычны кіёск.
10.40. Экалагічная хроніка.
10.55. «Перападох». Мультфільм.
11.10. «Германія. Праз 47 гадоў».
11.25. Новае пакаленне выбірае.
12.15. Інстытут чалавека.
13.00. Дак. фільм «Шпіёнскія гісторыі». 1-я серыя.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. «Чароўная лямпа Аладзіна». Маст. фільм.
15.55. Чырвоны квадрат.
16.35. У свеце жывёл.
17.35. «Пчала Мая».
18.00. КВН-92.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Рэпартаж ні пра што.
20.50. Маст. фільм «Аварыя» — дачка мента».
22.25. «Еўропа плюс».
23.00. Навіны.
23.15. «Еўропа плюс» (працяг).
23.40. «Гармонія». Маст. фільм (Венгрыя).

Канал «Расія»

7.20. «Засталіся там». Пра нашых ваеннапалонных у Афганістане.
8.05. Баскетбольны агляд НБА.
8.35. Надзвычайная сітуацыя.
9.20. Эскулап.
9.30. Тэма з варыяцыямі. «Віртуозы 2000 года».
10.00. «Плюс адзінаццаць».
12.00. «Маўлюд». Праграма, падрыхтаваная ісламскім цэнтрам г. Масквы.
13.20. Конны спорт. «Кентукі дэрбі».
14.15. Песні Льва Ашаніна.
14.45. Бюро падарожжаў.
15.30. «Бацькі і дзяды». Маст. фільм.
16.50. Гала-канцэрт салістаў Марыінскага тэатра ў Ковент-Гардэн (Англія).
18.00. «Зусім сакрэтна».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Музыка ў стылі «пепсі».
21.30. «Апошні ліст».
22.00. Весткі.
22.25. Праграма «А».
23.00. Адкрыты чэмпіянат Францыі па тэнісу.
23.30. Праграма «А» (працяг).

31 мая

НЯДЗЕЛЯ

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. Парады ўрача.
8.55. Канцэрт сімфанічнага аркестра Беларускага тэлебачання і радыё. Саліст А. Вардзі (Ізраіль).
9.45. Студыя «Мэта». «Не парываюцца даўнія сувязі...».
10.30. Асілак. Прамая лінія.
11.20. Час пісьма.
11.50. Сёння — Дзень хіміка.
12.20. «Варыянт Зомбі». Маст. фільм з субтытрамі.
13.45. «Травяная пастачка». Мультфільм.
14.00. НІКа.
14.35. «Савітар-цэнтр». Псіхалогія сямейных адносін.
15.35. «Крок» прадстаўляе... Існасць. Духоўна-рэлігійная праграма.
16.25. Адраджэнне. Частка 2-я.
17.10. З панядзелка... Чалавек і рынак.
17.55. Трэці тайм. Прамая лінія.
18.35. Нашы інтэрв'ю. «Кіраваць — не загадваць». Прымае ўдзел загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання народнай гаспадаркай пры Савеце Міністраў Беларусі А. М. Пашкевіч.
18.50. «Песню бярыце з сабою». 1-е аддзяленне.
20.00. Панарама.
20.25. «Каскад».
20.40. Калыханка.
21.00. «Песню бярыце з сабою». 2-е аддзяленне.
22.10. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Сальвадор» (ЗША). 2-я серыя.

І канал. Астанкіна

6.00. Час сілы духу.
7.00. Рытмічная гімнастыка.
7.30. Тыраж «Спортлата».
7.45. Мультфільмы «Няўлоўны Фунцік», «Фунцік і сышчык», «Фунцік і старая з вусамі».
8.20. Раным-рана.
9.00. Магчыма ўсё.
9.30. Свет у вольны час.
10.10. Ранішняя зорка.
11.05. Пад знакам «пі».
12.00. «Вясёлка», «Ліла і Чанезер» (Пакістан).
12.30. «Дапамажы себе сам».
13.00. «КТВ-1 і канал Франс інтэрнасіянаў» прадстаўляюць. «Запаведнікі дзікай прыроды». Фільм 1-ы.
13.30. «Маст. фільм «Марк і Сафі» (Францыя). Фільм 1-ы.
14.00. Навіны.
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. «Прынцэса Мімо». Мультфільм.
15.10. Клуб падарожнікаў.
16.00. Шмат галасоў — адзін свет. «Хаджа Насраддзін» (Турцыя).
16.05. Панарама.
16.45. Тэлеподыум.
17.00. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.50. Навіны.
18.10. Брэйн рынг.
19.00. Кінасалон «Рускае відэо».
19.30. «Раса паноў». Маст. фільм (Францыя).
21.00. Вынікі.
21.45. «Сёння». Рэлігійная праграма.
23.00. Навіны.
23.25. Музычны круіз.
23.50. «Дваццаць хвілін з анёлам». Маст. фільм.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Не толькі пра кіно.
8.20. Паралелі. «Неапалімая купіна».
8.50. Тэлекрасворд.
9.20. За сямю пячацямі.
10.05. «Суперкніга». Мультфільм. 14-я серыя.
10.30. Аты-баты...
11.00. «Дзень добры, мяне завуць Марына». Конкурсная праграма.
12.00. Чэмпіянат свету па баскетболу сярод прафесіяналаў НБА.
13.00. Весткі.
13.20. М. В. Гогаль. «Мёртвыя душы». Выконвае А. Філіпенка.
15.25. Тэлеасамблея.
16.15. Чэмпіянат свету па аўтагонках у класе «Формула-І».
18.45. Свята кожны дзень.
19.00. Весткі.
19.20. Момант ісціны.
20.15. «Жыў-быў доктар». Маст. фільм.
21.40. Тварам да Расіі.
22.00. Весткі.
22.20. Спартыўная карусель.
22.30. Рок-кафэ.
23.00. Адкрыты чэмпіянат Францыі па тэнісу.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

22 мая

Беларускае тэлебачанне

16.30. Навіны.
16.35. «Тапчумба», «Жыла-была пчолка», «Казка пра храбрага зайца», «Дадабай і будзільнік». Мультфільмы.
17.20. Наша школа — нашы старты. Эксперыментальная ДЮСШ № 18 г. Мінска.
18.00. Дак. фільмы «Дакранаюцца», «Экспазіцыя».
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Наш каментарый. «Піястры, піястры...»
19.15. Банк і рэформа. Пра дзейнасць Белагрупрамбанка.
19.45. «Лясная быль». Частка 2-я.
20.05. Беларускі агратэхнічны універсітэт: праблемы і перспектывы развіцця.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Сем старых і адна дзяўчына». Маст. фільм.
23.00. НІКа.
23.15. Паказвае Гродна. «Вячэрні канал». Інфармацыйна-музычная праграма.

І канал. Астанкіна

11.25. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
12.15. Іграе інструментальны ансамбль «Куток Расіі».
12.30. Навукова-папулярны фільм «Цені ў лесе» (Англія).
13.20. Брыдж.
13.45. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
14.25. «Па той бок рампы з усмешкай». К. Лучко.
14.45. «Хамелеон». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.50. «Газавае супольніцтва ў абноўленай Еўропе».
16.00. Мультфільм «Сонны камень». 5-я і 6-я серыі (Англія).
17.00. Навіны.
17.20. Чалавек і закон.
18.00. Тэлекампанія «Астанкіна» прадстаўляе праграмы «Сентрал тэлевіжн» (Англія). «Проста нармальная дзяўчынка». Маст. фільм; «Вяселле бурага мядзведзя». Мультфільм.
18.50. «Поле цудаў».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «ВІД» прадстаўляе: «Тоншоу», «Музагляд», «АнтыСНІД», «Шоу-біржа», Пляцоўка «Агляду».
У перапынку (23.00) — Навіны.
0.15. «Ранішняя зорка» ў начным эфіры.

Канал «Расія»

12.15. «Лотас». Тэлефільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. Першы тайм.
15.30. Фальклор. «Сусветная вёска».
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Непазнаны Сусвет.
17.45. М-трэст.
18.00. Экран крымінальных паведамленняў.
18.10. Белая варона.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Паралелі. Відэафільм пра стары Пецярбург «Развітанне».
20.00. «Артабстрал».
20.55. На сесіі ВС Расіі.
21.25. «К-2» прадстаўляе: «Каронка», «САС», «3, 2, 1» і маст. фільм «Доўгае шчаслівае жыццё».

23 мая

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Крадзеж». Маст. фільм. 1-я серыя.
10.00. «Вярэсце». Інфармацыйна-публіцыстычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Мультфільмы. «Піліпок», «Асцярожна! Карасі!», «Шчаня і сямёра гусянят», «Казка пра старое рэха», «Лямзі-Тыры-Вондзі, злы чараўнік».
12.00. 20 мінут рэдактара.
12.20. П. І. Чайкоўскі. Сімфонія № 6 «Патэтычная».
13.10. «Суперкніга». Мультфільм. 3-я серыя.
13.45. «Хто гэты чалавек?» Маст. фільм з субтытрамі.
15.15. Беларускі тэатр спорту «Кік Файтэр» паказвае: кікбоксінг, кетч, сань-да.
16.00. «Дэбюты». Саюз кампазітараў Беларусі прадстаўляе: Я. Паплаўскі і А. Ліцвіноўскі.
16.40. «Аб'екты-тэатр» на Балтыйскай вясне-92.
17.55. Футбол. «Тарпеда» (Мінск) — «Металург» (Маладзечна).
18.45. Процістаянне. Маральна-прававая праграма.
19.35. С. Пракоф'еў. «Вайна і мір». Фрагменты спектакля Тэатра оперы і балета Беларусі.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Баль» (Францыя—Італія).
23.25. НІКа.
23.40. Футбол-92. Вынікі тура. «Гомсельмаш» (Гомель) — «Дынама» (Мінск).

І канал. Астанкіна

6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. «Вочка». Мультфільм.
7.45. Садружнасць.
9.00. Радыё «Труба». Забаўляльная праграма.
9.30. Медыцына для цябе.
10.10. Цэнтр.
10.50. С. Рахманінаў. Рапсодыя на тэму Паганіні.
11.20. Гэта вы можаце.
12.00. Дак. фільм «Кіслотны дождж» (Англія).
13.00. Пані Ўдача.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. «Чырвоная імперыя». Фільм 7-ы «Вязні мінулага».
15.25. Кніжны двор.
16.15. Выступае Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр.
16.20. Чырвоны квадрат.
17.00. Маст. фільм «Кніга джунгляў» (Англія).
18.45. Тэатр плюс ТБ (да 50-годдзя А. Калягіна).
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Маст. фільм «Прапаўшая без вестак» (Англія). Серыя «Інспектар Морс».
22.30. Валейбол. Першынство сусветнай лігі. Зборная Японіі — зборная СНД. У перапынку (23.00) — Навіны.
23.50. Канцэрт з твораў І. Кальмана.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Крыніцы. «Знаменская вежа і яе жыхары».
8.00. Баскетбольны агляд НБА.
8.30. Паралельныя сусветы.
9.15. Прызнанне ў каханні.
9.30. Праграма «03».
10.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
11.15. «Як жыць будзем?»
12.00. Руская мова. Да Дня славянскага пісьменства і культуры.
12.30. «Бурда модэн» прапануе.
13.00. Весткі.
13.20. «Ледзяная ўнучка». Маст. фільм.
14.30. Шарман-шоу.
16.00. Пілігрым. Расійскае бюро падарожжаў.
16.55. Дак. панарама «Рудольф Нурыеў як ён ёсць».
17.45. Парламенцкі веснік.
18.00. Кабарэ «Вязглуздзіца».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. «Музыка ў стылі пепсі».
21.30. Маскі-шоу.
22.00. Весткі.
22.25. «Другая спроба Віктара Крохіна». Маст. фільм.
0.05. «Экзотыка».

НА ДВОР'Е

22 мая

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е, месцамі кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ў Віцебску 15—17, Мінску, Магілёве — 16—18, Гомелі — 17—19, Гродна — 20—22, Брэсце —22—24 градусы цяпла.

У наступныя двое сутак ападкаў не чакаецца. Тэмпература паветра ўначы 1—6 градусаў цяпла, 24 мая ва ўсходніх раёнах замаразкі да 2 градусаў, удзень 23 мая — 13—18, 24-га — 15—20 градусаў цяпла.

Узровень радыяцыйнага гама-фону 23 мая складаў: у Мінску, Гродна — 0,012, Віцебску, Гомелі — 0,014, Брэсце — 0,011, Магілёве — 0,016 мілірэнтгена ў гадзіну.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

В. Кебіч: «Вопыт Фінляндыі ўяўляе асаблівую каштоўнасць для Беларусі». Візіт Прэзідэнта Фінляндскай Рэспублікі ў Беларусь.

«У Савет Еўропы — цывілізаваным шляхам». Па матэрыялах нарады прадстаўнікоў Савета Еўропы і СНД.

«У краінах Садружнасці». «Кур'ер планеты». Вестка.

Анатомія канфлікту. **«У Авальнай зале і «дома».**

Актуальнае інтэрв'ю. **«Кароль памёр... няхай жыве каролі»**

Думкі ўслых. **«Справа прывычная».**

«Ох ужо гэтае відэо». Справы гандлёвыя.

Фільмы тыдня.

Праграма тэлеперадач.

Галоўны рэдактар
У. Б. НАРКЕВІЧ.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў—32-04-52, 32-41-92, навін—32-15-02, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

ПА НУМАРУ ДЗЯЖУРЫЛІ: член рэдакцыйнай калегіі Уладзімір Гойтан, намеснік адказнага сакратара Віктар Краўчанка, старшы карэктар Вікторыя Кляновік.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за паддор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63850.
Зак. № 101.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Пафарбаваць дапаможа лес

У мінулым выпуску расказвалася, як прыгатаваць фарбавальнік. Цяпер — за справу. Калі рэч хочаце пафарбаваць аднатонна, рабіце ўсё тан, як і са звычайнай прамысловай фарбай.

Для тых жа, хто вырашыў заняцца роспісам, — спосабы іншыя. Іх мноства. Пазнаёмімся з самым простым. Нагадаем толькі, што тканіна для роспісу павінна быць абавязкова з натуральных валокнаў, аднатонная. Лепш — белая.

ХАЛОДНЫ БАЦІК

Па-першае, патрэбен рэзервуючы раствор. На пары змешваюцца роўныя часткі бензіну і гумавага клею, дадаецца здробнены парафін (1/10 раней атрыманага аб'ёму) і крышачку расцёртай каніфолі.

Рэйсфедэрнай трубачкай па контуру малюнка раствор наносяць з абодвух бакоў на тканіну. Гэта перагародка не дасць вільгаці расцякацца ўбакі.

Такі роспіс нагадвае перагародчастую эмаль, вітраж ці мазаічнае пано.

БАНДАН

Ніткай перахопліваецца ўсё палатно тканіны, якая загадзя складзена «гармонікам», альбо нейкія яе часткі, сабраныя «зашчыпамі» ці вузламі. Чым шчыльней нітка будзе прылягаць да тканіны, тым выразней атрымаецца пакінуты след. Афарбоўку трэба заўсёды пачынаць з больш светлых фарбавальнікаў, паступова павялічваючы колеравую насычанасць.

Гэтым спосабам добра аднаўляць старыя рэчы.

ГАРАЧЫ БАЦІК («КРАКЛЕ»)

Тэхніка «кракле» добрая для тонкіх тканін. Спачатку наносіцца светлы жывапісны фон. Калі фарба прасохне, асобныя ўчасткі пакрываюцца ў два слаі добра разагрэтым воскам ці парафінам. Прасохшую тканіну мнуць, а атрыманыя на воску трэшчыны заліваюць фарбай больш цёмнага колеру. Частку воску саскрабаюць, апускаюць тканіну ў гарачую ваду. Рэшткі выпарваюць прасам праз паперу.

Гарачы бацік дазваляе выкарыстоўваць і іншыя спосабы: штрыхоўку, набрызг, вольны роспіс частак, непакрытых воскам.

Можна спалучаць самыя розныя спосабы фарбавання. Усё залежыць ад вашай выдумкі, фарбуемага матэрыялу і фарбаў.

Парады на ўсякі выпадак

ЗМОТВАННЕ НІТАК З МАТКА У КЛУБОК — справа працаёмкая. Але яе з поспехам можа выконваць стары магнітафон. Маток надзяецца на ножкі табурэткі. На вось падкасетніка магнітафона насаджваюць трубку са шчыльнай паперы, замацоўваюць на ёй канец ніткі і ўключаюць магнітафон.



БЫВАЕ ЦЯЖКА ЗАКРУЦІЦЬ ВІНТ у глыбокім і вузкім гняздзе. Асабліва ж устанавіць яго і зрабіць адвёрткай некалькі першых абаротаў.



Накруціце на вінт 3—4 віткі мяккага дроту і загніце свабодны канец так, каб зручна было брацца за яго рукой. Цяпер няцяжка ўстанавіць вінт і закруціць яго. Пасля некалькіх віткоў дрот можна зняць.

*ЛЕГКА